Нездавальняюча выконвалася і патрабаванне партыйна-ўрадавай пастановы аб забеспячэнні настаўнікаў прадуктамі харчавання і прамысловымі таварамі. На 1 верасня 1945 г. у школах рэспублікі працавала 41700 настаўнікаў. З іх у гарадах – 7000, у сельскіх школах – 34700 чалавек. На гарантаванае забеспячэнне па нормах рабочых прамысловасці, транспарту і сувязі былі прыняты толькі настаўнікі абласных цэнтраў – 3900 чалавек. Астатнія мелі права на забеспячэнне па нормах у адпаведнасці з пастановай СНК БССР і ЦК КП (б)Б "Аб матэрыяльным забеспячэнні настаўнікаў" [6, арк. 1].

Трэба адзначыць, што ўлады многіх раёнаў не надавалі належнай увагі кантролю за працэсам матэрыяльнага забеспячэння настаўнікаў [11, арк. 89]. У выніку частымі былі разбазарванне і крадзёж прызначаных для настаўнікаў тавараў. Больш таго, мелі месца шматлікія факты пераразмеркавання прадуктаў харчавання і прамысловых тавараў іншым асобам сакратарамі райкамаў і старшынямі райвыканкамаў [9, арк. 265–266].

Пры адсутнасці кантролю з боку ўлад абласныя і раённыя спажыўсаюзы, спасылаючыся на пастанову ўрада аб праве мясцовых органаў змяняць нормы забеспячэння, адвольна іх зніжалі. І нават гэта выдавалася нерэгулярна [7, арк. 45]. Аб дрэнным забеспячэнні прадуктамі харчавання і прамысловымі таварамі сведчаць шматлікія лісты настаўнікаў са скаргамі, якія паступалі ў аддзел школ ЦК ВКП(б)Б, Наркамасветы з усіх абласцей рэспублікі [6, арк. 1]. Праверкай, праведзенай Мінскім аблана, было ўстаноўлена, што факты нездавальняючага забеспячэння настаўнікаў мелі месца ва ўсіх раёнах. У прыватнасці, несвоечасова атрымлівалі хлебны паёк настаўнікі Барысаўскага раёна, а настаўнікі Вяляцкага, Зачысцкага, Бытчанскага сельсаветаў гэтага раёна наогул не забяспечваліся хлебам, прадуктамі харчавання і прамысловымі таварамі. Настаўнікі горада Барысава, згодна з планам размеркавання, павінны былі атрымаць прамтавараў на 16000 руб., аднак іх яны так і не атрымалі. Не атрымалі прамысловых тавараў і настаўнікі горада Мінска. У Заслаўскім раёне хлебны паёк настаўнікам быў выдадзены толькі пасля ўмяшання раённага пракурора [5, арк. 56].

Фонды мануфактуры, якая выдзялялася для настаўнікаў дзяржавай мэтавым прызначэннем, былі нязначнымі. Яны ні ў якім разе не вырашалі існуючую праблему забеспячэння настаўнікаў прыдатным для педагагічнай працы адзеннем і абуткам [6, арк. 1]. Набыць жа іх па камерцыйных коштах, якія былі ў шмат разоў вышэйшыя за пайковыя, педагогі не мелі магчымасці па прычыне невысокіх заробкаў. Звычайна ў гардэробе школьных настаўнікаў быў адзін камплект адзення, пераважна цёмнага колеру, сціплы і дастаткова стандартны.

Адсутнасць жылля, складаныя ўмовы працы, дрэннае забеспячэнне прадуктамі харчавання і прамысловымі таварамі, нізкія заробкі з'яўляліся прычынамі высокай цякучасці педагагічных кадраў.

Каб палепшыць матэрыяльна-бытавое становішча настаўніцкіх кадраў, зрабіць іх працу больш прывабнай, а грамадскі статус больш годным, Савет Міністраў БССР і ЦК КП(б)Б 6 лютага 1946 г. прынялі пастанову "Аб мерах па бытавым уладкаванні настаўнікаў і паляпшэнні іх забеспячэння харчовымі і прамысловымі таварамі" [10, арк. 66]. Пастанова прадугледжвала сацыяльную падтрымку школьных настаўнікаў па наступных напрамках: паляпшэнне жыллёвых умоў, забеспячэнне харчовымі і прамысловымі таварамі, выдзяленне ўчасткаў пад агароды ў сельскай мясцовасці і інш.

Урадава-партыйная дырэктыва была абмеркавана абкамамі КП(б)Б і выканкамамі абласных Саветаў рэспублікі. У прынятых пастановах, як правіла, адзначаліся нераспарадчасць мясцовых

органаў, іх нядбайнасць і няўвага да праблем настаўнікаў, прадпісвалася неадкладна прыступіць да выканання задач па паляпшэнні ўмоў паўсядзённага жыцця і працы педагагічных кадраў.

Аднак мясцовыя ўлады, як і раней, не надавалі належнай увагі матэрыяльна-бытавому становішчу настаўнікаў. Так, у Полацкай вобласці да пачатку 1946/47 навучальнага года пастанову Савета Міністраў БССР і ЦК КП(б)Б ад 6 лютага 1946 г. “Аб мерах па бытавым уладкаванні настаўнікаў і паляпшэнні іх забеспячэння харчовымі і прамысловымі таварамі” з 15 райкамаў і гаркамаў КП(б)Б абмеркавалі на сваіх пасяджэннях толькі два: Ветрынскі і Плісскі [10, арк. 68].

На практыцы многія загады, дырэктывы і законы, якія датычыліся матэрыяльна-бытавога становішча настаўнікаў, мясцовымі ўладамі, фінансавымі аддзеламі шэрагу выканкамаў і гандлюючымі арганізацыямі на месцах не выконваліся. Менавіта таму ўмовы паўсядзённага жыцця і працы настаўнікаў рэспублікі кардынальна не палепшыліся.

Аб гэтым сведчыць прыклад Полацкай вобласці. Нават на пачатак 1946/47 навучальнага года ў вобласці 30 настаўнікаў працягвалі жыць у зямлянках. Як і раней, па прычыне адсутнасці грошай на рахунках раённых фінансавых аддзелаў выплата кватэрных рабілася несвоечасова [10, арк. 66].

У шэрагу раёнаў вобласці (Браслаўскі, Відзаўскі, Дрысненскі, Асвейскі, Расонскі) парушаўся ўстаноўлены парадак забеспячэння настаўнікаў прамысловымі таварамі. У Расонскім і Асвейскім раёнах замест хлеба настаўнікі атрымлівалі зерне. У Браслаўскім раёне настаўнікі не атрымлівалі ніякіх харчоў, акрамя хлеба, забеспячэнне якім адбывалася з перабоямі [10, арк. 67].

У раёнах вобласці мела месца несвоечасовая выплата заработнай платы (Ветрынскі, Докшыцкі, Дрысенскі, Глыбоцкі, Плісскі). Запазычанасць настаўнікам па аплаце за студзень, люты, сакавік 1946 г. склала 354,3 тыс. руб. Па прычыне адсутнасці грашовых знакаў у дзяржбанку не былі выдадзены своечасова зарплата за чэрвень і адпускныя ў памеры 1574,3 тыс. руб. [10, арк. 68].

Істотна не палепшыліся матэрыяльна-бытавыя ўмовы настаўнікаў і ў Мінскай вобласці. На пачатак 1946/47 навучальнага года настаўнікі ў большасці школ не былі забяспечаны бясплатнымі кватэрамі. У многіх раёнах меліся затрымкі з выплатай квартплаты. У школах Уздзенскага раёна запазычанасць па квартплаце дасягала 6–7 месяцаў. Як і раней, мелі месца перабоі з забеспячэннем настаўнікаў прадуктамі харчавання. У школах Уздзенскага і Бярэзінскага раёнаў настаўнікі па 2–3 мясяцы не артымлівалі хлебнага пайка. Квартальны паёк на іншыя прадукты і прамысловыя тавары таксама выдаваўся несвоечасова [10, арк. 86].

Заключэнне. Такім чынам, з’яўляючыся часткай інтэлігенцыі, якой вышэйшае партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва адводзіла асаблівую ролю ў грамадстве, настаўнікі Беларусі ў пасляакупацыйныя і першыя пасляваенныя гады знаходзіліся ў вельмі складаных умовах у паўсядзённым жыцці і працы. Нягледзячы на тое, што савецкая ўлада шматлікімі пастановамі дэкларавала клопат пра матэрыяльнае становішча педагогаў, у тым ліку па жыллі і заробках, іх паўсядзённы быт, як вынікае з архіўных крыніц, быў выключна складаным: адсутнасць спрыяльных жыллёвых і элементарных бытавых умоў, нізкая і несвоечасовая выплата заработнай платы, нездавальняючае забеспячэнне харчовымі і прамысловымі таварамі. Гэта ў значнай ступені тлумачыцца тым, што ва ўмовах разрухі, голаду, недахопу фінансавання і матэрыяльных рэсурсаў мясцовыя органы кіравання выконвалі патрабаванні прынятых пастаноў па паляпшэнні матэрыяльных умоў настаўнікаў не ў поўным аб’ёме ці са значнай адтэрміноўкай.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 4п. Воп. 17. Спр. 21.

2. Народное образование в СССР. Общеобразовательная школа: сб. док., 1917–1973 г.г. / сост.: А. А. Абакумов [и др.]. – М.: Педагогика, 1974. – 559 с.

3. Экономика Советской Белоруссии, 1917–1967 / Акад. наук БССР, Ин-т экономики; отв. ред. Ф. С. Мартинкевич. – Мн.: Наука и техника, 1967. – 571 с.

4. Освобожденная Беларусь: док. и материалы: в 2 кн. / Ком. по арх. и делопроизводству при Совете Министров Респ. Беларусь [и др.]; сост.: В. И. Адамушко [и др.]. – Мн.: НАРБ, 2004. – Кн. 1: Сентябрь 1943 – декабрь 1944. – 398 с.

5. НАРБ. – Ф. 4 п. Воп. 17. Спр. 30.

6. НАРБ. – Ф. 4 п. Воп. 17. Спр. 43.

7. НАРБ. – Ф. 4 п. Воп. 17. Спр. 28.

8. НАРБ. – Ф. 4 п. Воп. 17. Спр. 29.
9. НАРБ. – Ф. 4 п. Воп. 17. Спр. 27.
10. НАРБ. – Ф. 4 п. Воп. 17. Спр. 38.
11. НАРБ. – Ф. 4 п. Воп. 17. Спр. 41.

References

1. National Archives of the Republic of Belarus, coll. 4p, aids 17, fol. 21 (in Belarusian).
2. Abakumov A. A., Kuzin N. P., Puzyrev F. I., Litvinov L. F. (comp.). Public education in the USSR. Comprehensive school: collection of documents, 1917–1973. Moscow, Pedagogika Publ., 1974. 559 p. (in Russian).
3. Martinkevich F. S. (ed.). Economy of Soviet Belarus, 1917–1967. Minsk, Nauka i tekhnika Publ., 1967. 571 p. (in Russian).
4. Adamushko V. I., Bondarenko N. A., Knat'ko G. D., Selemenev V. D. (comp.). Liberated Belarus: documents and materials. Book 1. September 1943 – December 1944. Minsk, National Archives of the Republic of Belarus, 2004. 398 p. (in Russian).
5. National Archives of the Republic of Belarus, coll. 4p, aids 17, fol. 30 (in Belarusian).
6. National Archives of the Republic of Belarus, coll. 4p, aids 17, fol. 43 (in Belarusian).
7. National Archives of the Republic of Belarus, coll. 4p, aids 17, fol. 28 (in Belarusian).
8. National Archives of the Republic of Belarus, coll. 4p, aids 17, fol. 29 (in Belarusian).
9. National Archives of the Republic of Belarus, coll. 4p, aids 17, fol. 27 (in Belarusian).
10. National Archives of the Republic of Belarus, coll. 4p, aids 17, fol. 38 (in Belarusian).
11. National Archives of the Republic of Belarus, coll. 4p, aids 17, fol. 41 (in Belarusian).

Информация об авторе

Андарало Игорь Александрович – кандидат педагогических наук, доцент, доцент кафедры культурологии и психолого-педагогических дисциплин. Белорусский государственный университет культуры и искусств (ул. Рабкоровская, 17, 220007, Минск, Республика Беларусь). E-mail: aia1106@mail.ru

Information about the author

Ihor A. Andaralo – Ph. D. (Pedagog.), Associate Professor, Associate Professor of the Department of cultural studies and psychological-pedagogical sciences. Belarysian State University of Cultyre and Arts (17 Rabkorovskaya Str., Minsk 220007, Belarus). E-mail: aia1106@mail.ru

ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)

МОВАЗНАЎСТВА

LINGUISTICS

УДК 811.161.3’373.21(476.5+476.7)
https://doi.org/10.29235/2524-2369-2026-71-4-302-311

Паступіў у рэдакцыю 13.05.2026
Received 13.05.2026

В. Ю. Радзюль

Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава, Віцебск, Беларусь

МІКРАТАПАНІМІЯ БЕЛАРУСКАГА ПААЗЕР’Я І ЗАХОДНЯГА ПАЛЕССЯ: ЛЕКСІКА-СЕМАНТЫЧНЫ АСПЕКТ

Аннотация. Проводится сопоставительный анализ микротопонимии Белорусского Поозерья и Западного Полесья, определяются как общие черты, так и региональные специфические особенности принципов номинации данных регионов. Рассматриваются лексико-семантические группы микротопонимов Белорусского Поозерья и Западного Полесья: микротопонимы, отражающие физические и географические особенности местности, флору и фауну; микротопонимы, отражающие хозяйственную деятельность человека, его образ жизни, религиозные представления и социальные отношения; микротопонимы, мотивированные именами собственными. На основе количественно-процентного соотношения определяются продуктивные и малопродуктивные типы и подтипы микротопонимов каждого из регионов.

Ключевые слова: микротопоним, Белорусское Поозерье, Западное Полесье, лексико-семантическая группа

Для цитирования: Радзюль, В. Ю. Мікратапанімія Беларускага Паазер’я і Заходняга Палесся: лексіка-семантычны аспект / В. Ю. Радзюль // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. – 2026. – Т. 71, № 4. – С. 302–311. https://doi.org/10.29235/2524-2369-2026-71-4-302-311

Volha Yu. Radziul

Vitebsk State University named after P. M. Masherov, Vitebsk, Belarus

MICROTOPONYMY OF THE BELARUSIAN POOZERIE AND WESTERN POLESSIE: LEXICAL-SEMANTIC ASPECT

Abstract. This article provides a comparative analysis of the microtoponymy of the Belarusian Poozerie and Western Polesie, identifying both common features and regionally specific characteristics of the nomination principles for these regions. Lexical and semantic groups of microtoponyms in the Belarusian Poozerie and Western Polesie are examined: microtoponyms reflecting the physical and geographical features of the terrain, flora and fauna; microtoponyms reflecting human economic activity, lifestyle, religious beliefs and social relations; microtoponyms based on proper names. Based on the quantitative percentage ratio, productive and unproductive types and subtypes of microtoponyms of each region are determined.

Keywords: microtoponym, Belarusian Poozerie, Western Polesie, lexical-semantic group

For citation: Radziul V. Yu. Microtoponymy of the Belarusian Poozerie and Western Polessie: lexical-semantic aspect. *Vestsi Natsyyanal’nai akademii navuk Belarusi. Seryia humanitarnykh navuk = Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus. Humanitarian Series,* 2026, vol. 71, no. 4, pp. 302–311 (in Belarusian). https://doi.org/10.29235/2524-2369-2026-71-4-302-311

Уводзіны. Мікратапонімы з’яўляюцца неад’емнай часткай гісторыка-культурнай спадчыны краіны: яны захоўваюць каштоўную інфармацыю пра рэльеф пэўнай тэрыторыі, асаблівасці раслiннага і жывёльнага свету, характар засялення, заняткі насельніцтва, асаблівасці эканамічнага развіцця пэўнага рэгіёна. Як заўважае Я. М. Адамовіч, «мікратапонімы – гэта россыпы народнай мудрасці, творчасць народнага генія, вынік тонкіх назіранняў чалавека над навакольнаю прыродаю» [1, с. 8].

© Радзюль В. Ю., 2026

Тым не менш наяўнасць у беларускім мовазнаўстве толькі пяці буйных прац, прысвечаных разгляду розных аспектаў мікратапаніміі Беларусі (дысертацыйныя даследаванні Я. М. Адамовіча, А. М. Прышчэпчык, В. М. Емельяновіч, Г. А. Івановай, В. А. Шклярыка), сведчыць пра недастатковую на сённяшні дзень распрацаванасць гэтага напрамку ў айчыннай анамастыцы. Таму найважнейшымі задачамі анамастыкі на сучасным этапе з'яўляюцца збор, сістэматызацыя і навуковае апісанне мікратапонімаў. Неабходнасць вывучэння ўласных найменняў дробных геаграфічных аб'ектаў у першую чаргу абумоўлена экстралінгвістычнымі фактарамі: адсутнасцю пісьмовай фіксацыі мікратапанімічных адзінак, масавым знікненнем населеных пунктаў, зменай пакаленняў, носьбітаў анамастычнай інфармацыі.

Мэта даследавання – параўнальна-супастаўляльны аналіз мікратапанімічнай прасторы Беларускага Паазер'я і Заходняга Палесся ў лексіка-семантычным аспекце.

Задачы даследавання – сістэматызаваць фактычны матэрыял, сабраны падчас дыялекталагічных практык, а таксама шляхам выбаркі з даступных друкаваных і рукапісных крыніц (слоўнікаў, манаграфій, артыкулаў, падборак мікратапонімаў і інш.); размеркаваць мікратапонімы Беларускага Паазер'я і Заходняга Палесся па лексіка-семантычных групах; на аснове колькасна-працэнтных суадносін вызначыць прадуктыўныя і малапрадуктыўныя тыпы мікратапонімаў кожнага з гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў; выявіць агульныя рысы і адрозненні ў сістэме паазерскай і заходнепалескай мікратапаніміі.

Матэрыялам даследавання паслужылі назвы дробных геаграфічных аб'ектаў: Беларускае Паазер'е – 2489 адзінак, Заходняе Палессе – 2500 адзінак.

Асноўнымі метадамі, выкарыстанымі ў дадзенай працы, з'яўляюцца апісальны, параўнальна-супастаўляльны, а таксама элементы статыстычнага аналізу.

Асноўная частка. Выбар дадзеных гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў абумоўлены тым, што і Беларускае Паазер'е, і Заходняе Палессе маюць ярка выяўленыя прыродныя, гістарычныя, лінгвістычныя і этнакультурныя асаблівасці. Унікальнасць Беларускага Паазер'я заключаецца ў тым, што «дадзены рэгіён мяжуе з трыма дзяржавамі – Літвой, Латвіяй і Расіяй, а пагранічча заўсёды ўяўляе сабой складаны сацыякультурны феномен, для якога характэрна ўзаемадзеянне і ўзаемаўплыў розных груп людзей, іх культур, светапоглядаў і моў» [2, с. 98]. Заходняе Палессе, якое з'яўляецца часткай арэала былой прарадзімы славян, найстаражытнай этнакантактнай зонай, захавала многія рэлікты агульнаславянскай і ўсходнеславянскай культуры, вывучэнне якіх уяўляе вялікую навуковую цікавасць [3, с. 3].

У анамастычнай літаратуры існуе вялікая колькасць лексіка-семантычных класіфікацый тапонімаў і мікратапонімаў (класіфікацыі Г. М. Мезенка, В. П. Лемцюговай, В. М. Емельяновіч, В. А. Шклярыка, Б. А. Крука, Ю. Г. Сагановіч, Н. Р. Якубук, В. А. Жучкевіча і інш.). Пры правядзенні лексіка-семантычнай класіфікацыі мікратапонімаў Беларускага Паазер'я і Заходняга Палесся за аснову прынята класіфікацыя Н. Р. Якубук [4, с. 184–187]. Аднак спецыфіка даследуемага мікратапанімікону дыктуе неабходнасць на базе гэтай класіфікацыі выпрацаваць больш канкрэтную класіфікацыйную схему, якая б улічвала ўсе адметнасці наяўнага мікратапанімічнага матэрыялу. Мікратапонімы Беларускага Паазер'я і Заходняга Палесся выразна падзяляюцца на тры лексіка-семантычныя групы: 1) мікратапонімы, якія адлюстроўваюць фізіка-геаграфічныя асаблівасці мясцовасці, флору і фаўну; 2) мікратапонімы, якія адлюстроўваюць гаспадарчую дзейнасць чалавека, яго побыт, вераванні, грамадскія адносіны; 3) мікратапонімы, суадносныя з уласнымі імёнамі.

1. Мікратапонімы, якія адлюстроўваюць фізіка-геаграфічныя асаблівасці мясцовасці, флору і фаўну. Апелятывы, што адлюстроўваюць прыродныя асаблівасці мясцовасці, паслужылі крыніцай для ўтварэння вялікай колькасці мікратапонімаў, якія складаюць прыблізна аднолькавую колькасць на тэрыторыях абодвух гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі: Беларускае Паазер'е – 42 % (1047 адзінак), Заходняе Палессе – 40 % (997 адзінак) – ад агульнай колькасці даследаваных мікратапонімаў. У залежнасці ад прыкмет, пакладзеных у аснову намінацыі, дадзены тып назваў дробных геаграфічных аб'ектаў дыферэнцыруецца на шэсць тэматычных падтыпаў:

1) *мікратапонімы, якія адлюстроўваюць асаблівасці рэльефу.*

На тэрыторыі Беларускага Паазер'я намі зафіксавана 290 адзінак (27,7 % ад агульнай колькасці мікратапонімаў, што адлюстроўваюць фізіка-геаграфічныя асаблівасці мясцовасці, флору і фаўну), якія суадносяцца з узвышанымі і нізіннымі формамі рэльефу: *Амша́ра* б. (Кальнік Докш.), *Бало́тнікі* л. (Прудзінкі В.-Дзв.), *Бало́тца* с. (Загацце Докш.), *Бало́ты* ўр. (Задоры Леп.), *Бало́цежа* л. (Абруб Беразвецкі Глыб.), *Бе́лае Бало́та* б. (Вілейка Докш.), *Высо́кія* л. (Казлы Мёр.), *Гара́* ўр. (Баранаўшчына Брасл.), *Гарава́тка* л. (Мярэцкія Глыб.), *Гары́шча* ўр. (Альгова Віц.), *Го́ркі* ч. в. (Астроўна Беш.), *Курга́н* узв. (Таўкіні Шарк.), *Паднізо́ўе* ўр. (Якубава Рас.), *Чо́рная Гара́* ўзв. (Лялеўшчына Гарад.), *Я́мішча* ўр. (Мішневічы Шум.) і інш.

У Заходнім Палессі гэты падтып прадстаўлены 194 назвамі (19,4 % у межах разглядаемага тыпу мікратапонімаў): *Боло́тцэ* сж. (Намакрава Лун.), *Во́вча Гора́* л. (Забалоцце Малар.), *Гора́* п. (Заямнае Драг., Еўлаты Ів.), *Го́рі* п. (Сінкевічы Лун.), *Горова́та* ўр. (Парэчча Пін.), *Горочкы́* п. і л. (Навасёлкі Кам.), *Града́* сж. (Бастынь Лун.), *Груд* п. (Горск Бяроз.), *Доліна* сж. (Азарычы Пін.), *Заболо́цье* п. (Сінкевічы Лун.), *Курганы́* п. (Лумна Кам.), *Луплёвскэ Бул́о́то* ўр. (Дубіца Брэсц.), *Ніз* п. (Бастынь Лун.), *Оболо́нне* сж. (Шумакі Брэсц.), *Острово́ы* п. (Бастынь Лун.), *Плёса* п. (Чыжэўшчына Жаб.), *Подгі́р'е* п. і б. (Хадасы Жаб.), *Я́міца* ўр. (Ланская Малар.) і інш.;

2) *мікратапонімы, матываваныя гідралагічнымі тэрмінамі.*

Дадзены падтып у мікратапаніміконе Беларускага Паазер'я прадстаўлены 196 мікратапонімамі, што складае 18,7 % ад агульнай колькасці дадзенага тыпу намінацыі: *Азе́рцы* б. (Лісна В.-Дзв.), *Азёрка* воз. (Саламір'е Пол.), *Ахрэ́маўская Лука́* ч. воз. (Ахрэмаўцы Брасл.), *Бе́лы Руч э́й* руч. (Каменка Брасл.), *Бы́цінская То́ня* ч. воз. (Лісна В.-Дзв.), *Вале́р'еў Аму́т* ч. р. (Сар'я В.-Дзв.), *За Азяро́м* ур. (Арлея Пол.), *Заво́зер'е* сж. (Саламір'е Пол.), *Зарэ́чный* л. (Рыгораўшчына Шарк.), *Крыні́ца* п. (Мярэцкія Глыб.), *Паазе́р'е* ч. в. (Бярозаўка Докш.), *Падрэ́чачка* ўр. (Гарэлае Докш.), *Прудо́к* б. (Ахрэмаўцы Брасл.), *Ставо́к* саж. (Павяцце Мёр.), *Ручэ́й* ур. (Зайцава В.-Дзв.), *Чо́рны Вір* ур. (Барсеева Лёзн.), *Яки́маўскі Брод* р. (Мішневічы Шум.) і інш.

У мікратапаніміі Заходняга Палесся гідралагічнымі тэрмінамі матывавана 121 назва (12,1 % ад агульнай колькасці мікратапонімаў дадзенага тыпу): *Броды́* сж. (Трасцянка Пін.), *Бу́йстрая Стру́га* сж. (Сітніца Лун.), *Вір* ур. (Хаціслаў Малар.), *Во́лянське Го́зыро* п. (Вулька Сіманавіцкая Драг.), *Водзяно́е* б. (Чыжэўшчына Жаб.), *Глыбо́кый Брід* луг (Востраў Пін.), *Зарі́ччэ* сж. (Хойна Пін.), *Крыні́ца* п. і сж. (Еўлашы Ів.), *Озэры́ско* б. (Вялікі Лес Драг.), *Под Рі́чкою* п. (Боркі Бяроз.), *Пруд* ур. (Колкі Стол.), *Пыдкрыні́ца* п. (Турная Івац.), *Радзівілова Са́жалка* саж. (Брашэвічы Драг.), *Рэ́чкі* б. (Гошчава Івац.), *Рэ́чышчо* ўр. (Іванкавічы Бяроз.) і інш.;

3) *мікратапонімы, якія адлюстроўваюць асаблівасці глебы.*

Значна меншую колькасць складаюць мікратапонімы Беларускага Паазер'я, суадносныя з відам, якасцю глебы (66 адзінак, 6,3 % ад агульнай колькасці дадзенага тыпу): *Глей* ур. (Лазічы Глыб.), *Гліна́ўка* л. (Павяцце Мёр.), *Гліні́шча* п. (Баяры Пол.), *Жвіро́к* п. (Галубаўшчына Брасл.), *Каме́ннае* ўр. (Перавоз Глыб.), *Каме́нне* п. (Саламір'е Пол.), *Лы́саўка* ўр. (Ласвіцкія Шум.), *Пагно́й* п. (Даравое Глыб.), *Пескава́тка* п. (Манякова Мёр.), *Пішча́ная Ме́ста* ўр. (Уладычына В.-Дзв.), *Пусты́р* ур. (Прудзінкі В.-Дзв.), *Пусты́льнік* ур. (Войтава В.-Дзв.), *Пяскі́* п. (Карасіна Брасл.) і інш.

У мікратапаніміконе Заходняга Палесся дадзены падтып назваў адзначаны таксама ў невялікай колькасці (54 адзінкі, 5,4 % ад агульнай колькасці дадзенага тыпу): *Гліні́шчэ* п. (Бастынь Лун.), *Глінó́вое* ўр. (Багданаўка Пін.), *Глы́ныска* п. (Дубіца Брэсц.), *Гнілу́ха* ўр. (Рэчыца Стол.), *Гно́і* п. (Радастава Драг.), *Ка́менка* п. (Трасцянка Пін.), *Лы́ска* п. і сж. (Асаўляны Драг.), *Пустого́лец* л. (Сітніца Лун.), *Пыскы́* ўр. (Юхнавічы Ів.), *Пышча́нка* п. (Сухоўчыцы Кобр.) і інш.;

4) *мікратапонімы, матываваныя фларыстычнымі назвамі.*

Вялікую па колькасці падгрупу мікратапонімаў Беларускага Паазер'я складаюць намінацыі, матываваныя фларыстычнымі назвамі (272 назвы, 26 % ад агульнай колькасці дадзенага тыпу). Спектр найменняў дадзенага падтыпу разнастайны, у якасці матывавальных асноў выступаюць назвы лясных і садовых масіваў: *Баро́к* л. (Казлы Мёр.), *Барсуко́ўскі Сад* ур. (Матырына Леп.), *Бе́лы Гай* л. (Вярэнькі Паст.), *Бярэ́знік* л. (Паметнікі Пол., Шэмітаўка Сен.), *Дубра́ва* ўр. (Галубова Рас.), *Е́лачнік* л. (Старыя Крукі Мёр.), *Лясі́нкі* ўр. (Цотава Чаш.), *Лясо́чак* ур. (Ноў Лёзн.), *Пу́шча* л. (Вілейка Докш.), *Рассе́яная Ро́шча* л. (Лапушніца Гарад.), *Узле́сак* п. (Дуброва Гарад.) і інш.;

найменні дрэў, кустарнікаў і паўкустарнікаў: *Асі́наўка* п. (Мураж Брасл.), *Ёлачкі* ўр. (Канавалава Гарад.), *Бярозы* ўр. (Барсукі Докш.), *Дубкі́* ўр. (Дуброва Гарад.), *Вя́зішча* ўр. (Лазічы Глыб.), *Калі́нава* ўр. (Мазалава Віц.), *Крушы́нка* л. (Лісна В.-Дзв.), *Лі́павіца* сж. (Беразіно Докш.), *Пад Іграўшыну* п. (Валынцы В.-Дзв.), *Падрабі́ніна* ўр. (Якубова Рас.) і інш.; назвы сельскагаспадарчых культур, травяністых раслін і кветак: *Васілёк* п. (Лагаўцы Рас.), *Капу́сцішча* п. (Сяляўшчына Рас.), *Капу́сьнікі* ўр. (П'яны Лес Докш.), *Лапу́шнік* л. (Серкавіцы Тал.), *Плюшчо́ўнік* ур. (Стайкі В.-Дзв.), *Хвашчава́цік* сж. (Лагаўцы Рас.), *Хвашча́нка* сж. (Пяцюлёва Пол.) і інш.; агульныя назвы кустарнікаў, зараснікаў і відаў раслін: *Агее́нкавы кусты́* ўр. (Мішневічы Шум.), *Лаза́* п. (Савуткі Шарк.), *Карчы́* ўр. (Слабада Докш., Сасноўка Пол., Лаўцы Глыб.), *Карчо́ўя* ўр. (Рожна Леп.), *Кусты́* ўр. (Яроміна Віц.), *Я́гадна* ўр. (Петракова Рас.), *Я́гады* ўр. (Уладычына В.-Дзв.) і інш.

Сярод даследаваных назваў дробных геаграфічных аб'ектаў Заходняга Палесся таксама зафіксавана вялікая колькасць мікратапонімаў, суадносных з назвамі расліннага свету (334 назвы, 33,5 % ад агульнай колькасці намінацый дадзенага тыпу). Дадзеная падгрупа прадстаўлена назвамі лясных і садовых масіваў: *Баро́к* л. (Пескі Бяроз.), *Берэ́знікі* сж. (Азарычы Пін.), *Бір* п. (Дзеткавічы Драг.), *Боровóе* п. (Ушкавіца Кобр.), *Гаёк* п. і л. (Пескі Кобр.), *Дубро́ва* п. (Хотамель Стол.), *Зале́ссе* п. (Валішча Пін.), *Лесо́к* п. (Азарычы Пін.), *Садо́к* п. (Ласіцк Пін.) і інш.; найменнямі дрэў, кустарнікаў і паўкустарнікаў: *Асі́на* п. і л. (Сенькавічы Івац.), *Багно́* сж. (Хойна Пін.), *Бэзо́к* сж. (Сітніца Лун.), *Бэро́зовэ* сж. і п. (Валішча Пін.), *Ве́рбнэ* ўр. (Аздамічы Стол.), *Вы́шня* сж. (Бастынь Лун.), *В'язо́дуб'е* п. (Сітніца Лун.), *Гру́шкы* п. (Лапацін Пін.), *Дубкі́* ўр. (Колкі Стол.), *За Хво́йкай* п. (Гошчава Івац.), *Калі́на* ўр. (Глінка Стол.), *Клёны* п. і ч. в. (Гошава Драг.), *Крушына́* п. (Пярэспа Драг.), *Подмалі́ннік* ч. в. (Сінкевічы Лун.), *Рокі́тнік* сж. (Харава Пруж.), *Со́сна* п. (Горск Бяроз.), *Чыро́мха* ўр. (Броннае Драг.), *Я́сень* л. (Сітніцкі Двор Лун.) і інш.; назвамі сельскагаспадарчых культур, травяністых раслін і кветак: *Бульбо́в'і* ўр. (Дубай Стол.), *Капу́снык* п. (Сычы Брэсц.), *Кропы́ўныца* луг (Жоўкіна Пін.), *Ма́кавішча* ўр. (Доўгае Івац.), *Па́пороць* ур. (Травы Кобр.), *Хвошчэва́цец* п. (Бастынь Лун.), *Хмылны́к* ур. (Сычы Брэсц.) і інш.; агульнымі назвамі кустарнікаў, зараснікаў і відаў раслін: *Корчы́шчэ* ўр. (Парэчча Пін.), *Ку́стоўе* ўр. (Купяцічы Пін.), *Ло́зы* сж. (Сітніца Лун.) і інш.;

5) *мікратапонімы, матываваныя фаўністычнымі назвамі.*

У Беларускім Паазер'і (52 назвы, 5 % ад агульнай колькасці дадзенага тыпу мікратапонімаў) прадстаўлены найменні, матываваныя назвамі жывёл: *Бабры́* ўр. (Прудзінкі В.-Дзвін.), *Барсукі́* л. (Бягомль Докш.), *Ваўчы́ца* ўр. (Зазыбы Віц.), *Зме́еўка* ўр. (Гогалеўка Чашн.), *Каро́ўе* п. (Шатрова В.-Дзвін.), *Сыба́чына* сж. (Шэмітаўка Сен.) і інш.; птушак: *Усле́* сж. (Вярхоўе Беш.), *Варо́нішча* п. (Казлы Мёр.), *Ву́тачкі* б. (Шэмітаўка Сен.), *Гуся́тнік* ўр. (Купчэлі Брасл.), *Лебядзі́нец* воз. (Казлы Мёр.), *Ла́стаўшчына* ўр. (Ісаі Брасл.) інш.; насякомых: *Жукі́* п. (Высачаны Лёзн.), *Камары́* п. (Бортнікі Глыб.) і інш.; рыб: *Акунёўка* воз. (Лісна В.-Дзвін.), *Ляшчо́ўка* ч. воз. (Крывасельцы Брасл.).

У мікратапаніміі Заходняга Палесся (52 назвы, 5,3 % ад агульнай колькасці дадзенага тыпу мікратапонімаў) асноўную колькасць назваў складаюць мікратапонімы, матываваныя назвамі жывёл: *Бара́н* ур. (Дубіца Брэсц.), *Барсукі́* п. (Сітніцкі Двор Лун.), *Быкі́* л. (Горск Бяроз.), *Во́ўча* луг (Жоўкіна Пін.), *За́йчык* сж. (Пацы Драг.), *Коза́* п. (Шумакі Брэсц.), *Лосі́нец* л. (Белавуша Стол.), *Мідвэ́жэ* п. (Закляценне Драг.), *Свінья́* ўр. (Колкі Стол.), *Чэрэпа́ха* ўр. (Дубай Стол.). Радзей у якасці ўтваральных асноў выступаюць назвы птушак і насякомых: *Воро́нне* ўр. (Падрэчаны Кам.), *Гусь* л. (Плоскінь Пін.), *Мура́шнікі* л. (Дубіца Брэсц.);

6) *мікратапонімы, матываваныя характарыстыкай аб'екта.*

У мікратапаніміі Беларускага Паазер'я (171 назва, 16,3 % ад агульнай колькасці разглядаемага тыпу намінацый) гэты падтып фарміруюць назвы, суадносныя з лакалізацыяй аб'екта ў прасторы, з яго канфігурацыяй: *Ву́зенькія* п. і сж. (Хвасты Брасл.), *Вэлі́кае* ўр. (Казлы Мёр.), *До́ўгая* б. (Хвасты Брасл.), *Зады́* п. (Лагаўцы Рас.), *Кане́ц* ўр. (Поціна В.-Дзвін.), *Кары́цішча* ўр. (Лазукі Чаш.), *Качарга́* лес (Беразіно Докш.), *Клін* ур. (Якубова Рас.), *Кут* ур. (Мяжно Пол.), *Крук* ур. (Рудая Глыб.), *Рог* луг (Бярозава Уш.), *Угль́* п. (Старыя Валосавічы Леп.), *Штань́* п. (Шчарбацкія Глыб., Галубоўшчына Брасл.), *Шыро́кая* сж. (Шчаперня Пол.) і інш.; з якаснай характарыстыкай аб'екта, яго асаблівасцямі, колерам: *Бе́лае* воз. (Казлы Мёр.), *Гарэ́лік* л. (Вераб'і, Жарнасекі Пол.), *Зялёнка* сж. і л. (Казлы Міёр.), *Не́маразь* кр., якая не замярзае (інфарм.) (Ходцы Сен.), *Пало́мы* л.

(Залессе Пол.), *Ржа́вае* б. (Камень Леп.), *Серабра́нка* кр. (Якубава Рас.), *Сы́рнік* п., якое заўсёды застаецца сырым (інфарм.) (Рачнёва Мёр.), *Чо́рнае* воз. (Казлы Мёр.) і інш.

Паказчыкі дадзенага падтыпу ў заходнепалескім мікратапаніміконе склалі 242 адзінкі і 24,3 % адпаведна. Сюды ўвайшлі мікратапонімы, суадносныя з лакалізацыяй аб'екта ў прасторы, з яго канфігурацыяй: *Бле́жнэ* п. (Стрыгава Кобр.), *Вели́кі Коне́ц* ч. в. (Горталь Івац.), *Верхі́* л. (Манасеева Лун.), *Ві́лы* сж. (Сітніца Лун.), *Грань* п. (Азярніца Лун.), *Гры́вка* сж. (Еўлашы Ів.), *Да́льшэе* п. (Сітніца Лун.), *До́ўгае* ўр. (Дубай Стол.), *Кары́то* сж. (Сіманавічы Драг.), *Край* ур. (Медная Брэсц.), *Кру́глэ* ўр. (Радзеж Малар.), *Крукы́* ч. в. (Стрыгава Кобр.), *Крыво́е* л. (Навасёлкі Кам.), *Малы́і* п. і паша (Сіманавічы Драг.), *Подко́ва* воз. (Сычы Брэсц.), *Шыро́кі* л. (Лінова Пруж.), *Ш́йка* ўр. (Варатынічы Кобр.), *Ўзка* п. (Хмелева Кам.) і інш.; з якаснай характарыстыкай аб'екта, яго асаблівасцямі, колерам: *Буе́нне* б. (Брашэвічы Драг.), *Выго́да* л. (Сітніцкі Двор Лун.), *Гла́ткэ* л. (Субаты Драг.), *Глу́ха* п. (Бастынь Лун.), *Горы́лэ* л. (Дзеткавічы Драг.), *Грузко́е* ўр. (Варатынічы Кобр.), *Замо́крэ* ўр. (Лунін Лун.), *Зелёное* п. і сж. (Елна Лун.), *Кра́сное* ўр. (Вулька Другая Лун.), *Руды́е* п. (Бастынь Лун.), *Стра́шнэ* б. (Лунін Лун.), *Суховы́шча* сж. (Гошава Драг.), *Холо́днэ* л. (Лунін Лун.), *Чо́рна* п. (Дарапеевічы Малар.) і інш. (табл. 1).

Табліца 1. **Мікратапонімы, якія адлюстроўваюць фізіка-геаграфічныя асаблівасці мясцовасці, флору і фаўну**

Table 1. **Microtoponyms reflecting the physical and geographical features of the area, flora and fauna**

Падтыпы	Беларускае Паазер'е	Заходняе Палессе
1. Мікратапонімы, якія адлюстроўваюць асаблівасці рэльефу	**290** (27,7 %)	**194** (19,4 %)
2. Мікратапонімы, матываваныя гідралагічнымі тэрмінамі	**196** (18,7 %)	**121** (12,1 %)
3. Мікратапонімы, якія адлюстроўваюць асаблівасці глебы	**66** (6,3 %)	**54** (5,4 %)
4. Мікратапонімы, матываваныя флярыстычнымі назвамі	**272** (26 %)	**334** (33,5 %)
5. Мікратапонімы, матываваныя фаўністычнымі назвамі	**52** (5 %)	**52** (5,3 %)
6. Мікратапонімы, матываваныя характарыстыкай аб'екта	**171** (16,3 %)	**242** (24,3 %)
Усяго	**1047** (100 %)	**997** (100 %)

2. Мікратапонімы, якія адлюстроўваюць гаспадарчую дзейнасць чалавека, яго побыт, вераванні, грамадскія адносіны. Назвы, якія адпавядаюць гэтаму тыпу, у мікратапанімічнай сістэме Беларускага Паазер'я налічваюць 590 адзінак, што складае 23,7 % ад агульнай колькасці найменняў, у мікратапаніміконе Заходняга Палесся – 471 адзінку і 18,8 % адпаведна. Назвы дробных геаграфічных аб'ектаў дадзенага тыпу характарызуюцца разнапланавым з лексічнага пункту гледжання ўтварэннем і вылучаюцца ў наступныя падтыпы:

1) *мікратапонімы, матываваныя тыпам, часткай паселішча.*

На тэрыторыі Беларускага Паазер'я неаднаразова сустракаюцца назвы, матываваныя назвамі тыпаў паселішча і жылля (72 назвы, 12,2 % ад агульнай колькасці разглядаемага тыпу намінацыі): *Асе́ліца* п. (Бягомль Докш.), *Гарадзе́ц* ўзв. (Лісна В.-Дзвін.), *Гарадзі́шча* ўзв. (Слабада Леп.), *Дво́рышча* п. (Вітунічы Докш.), *Засце́нак* ур. (Гарачэвічы Леп.), *Кі́слы Ху́тар* ч. в. (Чысці Вардамскія Докш.), *Пад Се́лішчам* сж. (Казлы Мёр.), *Пасёлак* ч. в. (Сіманавічы Чаш.), *Слабада́* ўзв. (Белая Ліпа Сен.), *Сядзі́бы* п. (Караліно Докш.), *Сяліба́шча* ўр. (Галубоўшчьша Брасл.) і інш.

У сістэме мікратапаніміі Заходняга Палесся дадзены падтып прадстаўлены 51 адзінкай (10,8 % ад агульнай колькасці дадзенага тыпу мікратапонімаў): *Асе́ліца* ўр. (Галік Івац.), *Гарады́* ўр. (Гурка Драг.), *Дво́рышча* п. (Жоўніна Пін.), *Засці́нкы* п. і сж. (Стрыгава Кобр.), *Село́* ч. в. (Горталь Івац.), *Сыды́ба* ўр. (Гарадзец Кобр.), *Хуторцы́* ўр. (Колбікі Стол.) і інш.;

2) *мікратапонімы, матываваныя назвамі будынкаў жыллёвага і гаспадарчага прызначэння* (Беларускае Паазер'е – 28 назваў, 4,7 % ад агульнай колькасці разглядаемага тыпу намінацыі): *Драўні́к* л. (Марцюхова Тал.), *До́мікі* л. (Верамееўшчына Дубр.), *Загуме́ння* ўр. (Мяжно Пол.), *Звяры́нец* ур. (Рудая Глыб.), *Зо́раў Ток* ур. (Навасёлкі Паст.), *Зы́гарадзь* ур. (Казлы Мёр., Матырына Леп.), *Камо́ркі* сж. (Сяляўшчына Рас.), *Маркаяна́ва Пу́ня* л. (Канстантова Сен.), *Пагробо́к* л. (Антонава В.-Дзв.), *Фе́рма* п. (Чэміса Пол.) і інш.

Назвамі будынкаў жыллёвага і гаспадарчага прызначэння матываваны 27 мікратапонімаў Заходняга Палесся (5,7 % ад агульнай колькасці дадзенага тыпу мікратапонімаў): *Гу́мна* п. (Сіт-

ніца Лун.), *Звэры́нэць* ур. (Ляжыткавічы Драг.), *Погрыба́* п. (Лумна Кам.), *Токові́шчэ* п. (Бастынь Лун.), *Хлывы́шчэ* п. (Броннае Драг.), *Хе́рма* л. (Асаўляны Драг.) і інш.;

3) *мікратапонімы, матываваныя назвамі зямельных участкаў.*

У Беларускім Паазер'і колькасць назваў дадзенай групы налічвае 218 адзінак (37 % ад агульнай колькасці разглядаемага тыпу мікратапонімаў). Сюды ўвайшлі назвы дробных геаграфічных аб'ектаў, суадносныя са спосабамі распрацоўкі зямлі: *Асцяро́бы* п. (Богіна Брасл.), *Вы́гары* ўр. (Нарушова В.-Дзв.), *Вы́дзерыца* луг (Забабуры Гарад.), *Ля́ды* ўр. (Ісаі Брасл., Задуброўе Віц.), *Па́секі* ўр. (Барсукі Докш.), *Церабе́ж* п. (Вераб'і Пол.) і інш.; спосабамі набыцця зямельнага ўчастка: *Дзіля́нка* л. (Атрубак Докш.), *Драбня́* ўр. (Пруднікі Докш.), *Куплёнка* ўр. (Ноў Лёзн.), *Надда́ткі* п. (Караліно Докш.), *Прыро́з* п. (Смалоўка Гарад.) і інш.; мэтай выкарыстання зямельнага ўчастка: *Вы́ган* ур. (Павяцце Мёр.), *Вялі́кая По́жня* сж. (Мярэцкія Глыб.), *Гаро́д* л. (Парэчча Докш.), *Муро́жніца* ўр. (Лабуноўшчына Уш.), *Па́сбішча* ўр. (Гарадзец Уш.), *Пастаўні́к* (Богіна Брасл.) і інш.; назвамі ворнай зямлі: *Ма́лае По́льца* п. (Леснікі Глыб.), *Ні́ўкі* ўр. (Залессе Глыб.), *Па́хата* ўр. (Паметнікі Пол.), *Па́шня* п. (Ворань Леп.) і інш.; назвамі зямельных участкаў у залежнасці ад даўнасці распрацоўкі: *За́леж* п. (Мураж Брасл.), *Дзірва́н* п. (Мураж Брасл.), *Наві́нка* п. (Вараб'і Пол.), *Паме́ты* сж. (Сяляўшчына Рас.), *Старына́* лес (Запруддзе Глыб.) і інш.; назвамі мер зямлі: *Імша́рныя Шнуры́* п. (Караліно Докш.), *Маргі́* п. (Караліно Докш.) і інш.

На тэрыторыі Заходняга Палесся адзначана 217 (46,1 %) назваў, суадносных са спосабамі распрацоўкі зямлі: *Выгары́* сж. (Мацы Кобр.), *Вы́дранка* п. (Лунін Лун.), *Гмы́раў Пацяро́б* л. (Сенькавічы Івац.), *Ля́до* ч. в. (Горталь Івац.), *Па́сека* п. (Турная Івац.), *По́тырэб* ур. (Батарэя Бяроз.), *Церце́ж* п. (Бастынь Лун.) і інш.; спосабамі набыцця зямельнага ўчастка: *Дыля́нка* луг (Жоўкіна Пін.), *Ку́пленіца* п. (Азарычы Пін.), *Мэнятэ́ця* ўр. (Замосце Кобр.), *Прыда́ткі* п. (Тамашоўка Брэсц.), *Ры́зка* п. (Каўняцін Пін.) і інш.; мэтай выкарыстання зямельнага ўчастка: *Вы́гон* ур. (Падрэчаны Кам.), *Пастоўны́к* луг (Закляценне Драг.) і інш.; назвамі ворнай зямлі: *Ні́ўка* п. (Турная Івац.), *Політо́к* п. (Сычы Брэсц.), *Поля́нка* ўр. (Колбікі Стол.), *Хомыны́вськы Поля́* п. (Сімманавічы Драг.) і інш.; назвамі зямельных участкаў у залежнасці ад даўнасці распрацоўкі: *Навіна́* ўр. (Вялікі Краснік Пруж.), *Старына́* п. (Лунін Лун.) і інш.; назвамі мер зямлі: *Волóка* п. (Боркі Бяроз.), *Дысяты́на* ўр. (Навасёлкі Кобр.), *Моргі́* ўр. (Сочыўкі Ів.) і інш.;

4) *мікратапонімы, матываваныя былым размяшчэннем прадпрыемства, установы, былым месцам промыслу, прызначэннем аб'екта* (Беларускае Паазер'е – 47 назваў, 8 % ад агульнай колькасці разглядаемага тыпу намінацыі): *Бу́дзішча* сж. (Застадолле Сен.), *Ільнозаво́д* ч. в. (Сініцы Рас.), *Ку́зня* ўр (Дуброва Гарад.), *Масцярскі́я* ўр. (Хутар Дзедзіна Мёр.), *Млын* ур. (Папшычы Глыб.), *Піваварны́шча* (Ворань Леп.), *Піларáма* л. (Гута Паст.), *Рум* ур. (Луг Сен.), *Смалянýха* п. (Мішневічы Шум.), *Цагéльня* п. (Вяркуды Уш.) і інш.

У мікратапаніміі Заходняга Палесся зафіксаваны 34 (7,2 %) намінацыі, матываваныя назвамі вытворчых пабудоў і прадпрыемстваў: *Брова́ршчына* п. (Імянін Драг.), *Бу́дышча* п. (Мацы Кобр.), *Гу́та* п. (Гутава Драг.), *Млíны́ско* п. (Лука Стол.), *Смоля́рня* п. (Гошава Драг.), *Цыге́льня* п. (Дзеткавічы Драг.) і інш.;

5) *мікратапонімы, суадносныя з дзеяннем, якое адбывалася на аб'екце, ці з прадметам на аб'екце.*

Дадзены падтып уключае 48 найменняў на тэрыторыі Беларускага Паазер'я (8,1 % ад агульнай колькасці дадзенага тыпу мікратапонімаў): *Абла́ва* п., дзе раней учынялі аблаву на ваўкоў (Ваўненкі Гарад.), *Анто́севы Ля́пці* ч. в., дзе мужык згубіў лапці (інфарм.) (Пыршчына Глыб.), *Газо́ўня* ч. в., дзе раней запраўлялі газавыя балоны (Бабічы Глыб.), *Купа́нка* саж. (Таўкіні Шарк.), *Мачу́лішча* ўр., дзе мачылі лён (інфарм.) (Круткі Глыб.), *Па́нская Купа́льня* ўр. (Узрэчча Глыб.), *Пу́шка* ўзв., на якой стаіць помнік воінам-артылерыстам (інфарм.) (Крынкі Лёзн.), *Ра́да* ч. в., дзе збіраліся, каб пагаварыць, парадзіцца (інфарм.) (Баталі Гарад.), *Стрэ́льбішча* л. (Пруднікі Докш.) і інш.

У мікратапаніміі Заходняга Палесся зафіксавана 45 назваў дадзенага падтыпу, што складае 9,6 % ад агульнай колькасці разглядаемага тыпу мікратапонімаў: *Гу́лін* л., калісьці тут гулялі, праводзілі ўсе вясковыя святы (інфарм.) (Сенькавічы Івац.), *Заса́дка* ўр., дзе паляўнічыя рабілі

засады на звяроў (інфарм.) (Гаравіца Драг.), *Копані́* б., дзе капаюць торф (Галоўчыцы Драг.), *Купа́ля* саж. (Брашэвічы Драг.), *Мо́рдык* п., калісьці паны тут мардавалі сялян (інфарм.) (Брашэвічы Драг.), *Сідзено́к* л., дзе адпачывалі пастухі (інфарм.) (Лунін Лун.), *Ховані́* б., у час шведаў людзі хаваліся ў гэтых балотах (інфарм.) (Крушына Брэсц.), *Чоўнові́ца* д., насыпаная праз балота; па абодва бакі яе былі равы, па якіх чаўнамі вывозілі сена з балота (інфарм.) (Харава Пруж.) і інш.;

6) *мікратапонімы, матываваныя назвамі шляхоў зносін і мастоў.*

У мікратапаніміі Беларускага Паазер'я гэты падтып назваў прадстаўлены 78 адзінкамі (13,2 % ад агульнай колькасці дадзенага тыпу мікратапонімаў): *Асфальто́ўка* ур. (Дуброва Гарад.), *Гасці́нец* д. (Бярозаўка Докш.), *Зага́ць* ур. (Зазыбы Віц.), *Задаро́жжа* ўр. (Навасёлкі Віц.), *Кла́дка* ч. в. (Падбярэззе Віц.), *Масты́* ўр. (Курына Віц.), *Шлях* ч. в. (Пнявічы Дубр.), *Яки́маўскі Брод* ур. (Мішневічы Шум.) і інш.

У Заходнім Палессі зафіксавана 36 мікратапонімаў (7,6 % у межах разглядаемага тыпу мікратапонімаў): *Гаць* ур. (Батарэя Бяроз.), *Госці́нец* л. (Турная Івац.), *Грэ́бля* д. (Сычы Брэсц.), *Доро́га* ўр. (Дубай Стол.), *Замосто́ччэ* п. (Валішча Пін.) і інш.;

7) *мікратапонімы, якія адлюстроўваюць рэлігійныя вераванні, міфалогію.*

На тэрыторыі Беларускага Паазер'я гэтая група ўключае ў сябе 45 найменняў (7,6 % ад агульнай колькасці дадзенага тыпу мікратапонімаў): *Змяі́ная Магі́ла* ўзв. (Завідзічы Леп.), *Касцёл* д. (Баравыя Чашн.), *Крыж* д., на баку якой стаіць крыж для малітвы (інфарм.) (Падбярэззе Віц.), *Свята́рня* ч. в. (Асада Дзедзіна Мёр.), *Царкаві́шча* ўр. (Марчанкі Гарад.), *Царко́ўнае* ўзв. (Свілы Шарк.), *Чо́ртава Ме́сца* б. (Падбярэззе Віц.) і інш.

У мікратапаніміі Заходняга Палесся зафіксавана ўсяго 10 (2,1 %) такіх назваў: *Манасты́рськэ* л. (Дубіца Брэсц.), *Могы́лнэ* ўр. (Добрае Кобр.), *Свято́е* сж. (Асобавічы Пін.), *Тры Крыжы́* ўр., дзе знаходзяцца тры магілы (інфарм.) (Дзеткавічы Драг.), *Цэрко́ўная* ч. в. (Выганашчы Івац.) і інш.;

8) *мікратапонімы, матываваныя назвай прафесіі, родам заняткаў* (Беларускае Паазер'е – 19 назваў, 3,2 % ад агульнай колькасці разглядаемага тыпу намінацыі): *Бо́ндараўка* сж. (Беразіно Докш.), *Ганчаро́ва* ўр. (Замошша Леп.), *Кавалёўка* л. (Паметнікі Пол.), *Канава́лішча* ўр. (Баннікі Гарад.), *Катляро́ўка* ч. в. (Пашкі Шарк.), *Рыбакі́* п. (Рачнёва Мёр.), *Папо́ўка* ўр. (Гарачэвічы Леп.) і інш.

У мікратапаніміконе Заходняга Палесся налічваецца 11 адзінак разглядаемага падтыпу назваў дробных геаграфічных аб'ектаў (2,3 % у межах дадзенага тыпу мікратапонімаў): *Бондаро́ўшчына* ўр. (Багданаўка Пін.), *Бо́ртнічча* ўр. (Замосце Кобр.), *Ковалёвэ* п. (Галоўчыцы Драг.), *Конюх* сж. (Намакрава Лун.), *Попо́ўшчына* п. (Пруж. Брэсц.) і інш.;

9) *мікратапонімы, матываваныя назвамі сацыяльных груп і іх удзельнікаў, сацыяльных статусаў* (Беларускае Паазер'е – 20 назваў, 3,4 % ад агульнай колькасці разглядаемага тыпу намінацыі): *Ба́цькаўшчына* ч. в. (Вялікая Выдрэя Лёзн.), *Баярка* ч. в. (Бароўка В.-Дзв.), *Браткі́* п. (Сенькавічы Івац.), *Дзе́даўка* п. (Расна Сен.), *Казакі́* ч. в. (Сакольнікі Віц.), *Кня́жынка* воз. (Бабруйшчына Глыб.), *Купчы́ха* ўзв. (Лісна В.-Дзвін.), *Ма́чаха* б. (Крынкі Лёзн.), *Па́нічына* ўр. (Баркова Гарад.) і інш.

Паказчыкі дадзенага падтыпу ў мікратапаніміконе Заходняга Палесся склалі 21 адзінку і 4,6 % адпаведна: *Ба́ба'е* сж. (Шумакі Брэсц.), *Ба́бушка* п. (Вулька Лоеўская Пін.), *Батракі́* п. (Лумна Кам.), *Дзі́довська* ўр. (Батарэя Бяроз.), *Козакі́вка* ўр. (Добрае Кобр.), *Па́ново* сж. (Азарычы Пін.), *Шляхе́тскэе* б. (Елка Лун.) і інш.;

10) *мікратапонімы, матываваныя этнонімамі.*

Нягледзячы на тое, што тэрыторыя Беларускага Паазер'я гістарычна заўсёды была месцам перасячэння народаў і культур, яе мікратапанімія, суадносная з этнічнымі назвамі, налічвае ўсяго 15 адзінак (2,6 % ад агульнай колькасці дадзенага тыпу мікратапонімаў): *Белару́сы* ч. в. (Кошчава Беш.), *Латы́гава* ч. в. (Нябышына Докш.), *Літо́ўка* ўр. (Пятроўшчына Глыб.), *Ля́хаўка* ўр. (Маргавіца Докш.), *Маскалі́ха* ўр. (Станіслаўцы Глыб.), *Ру́скае* ўр. (Гальніца Рас.), *Тата́рскія* ч. в. (Сакольнікі Віц.), *Цыга́нка* ўзв. (Чапаеўскі В.-Дзв.), *Шве́даўка* ўзв. (Заскаркі Пол.) і інш.

Мікратапонімы, утвораныя ад этнонімаў, у складзе заходнепалескай мікратапаніміі складаюць усяго 4 % (19 адзінак) ад агульнай колькасці дадзенага тыпу мікратапонімаў: *Літві́нуўка* ўр. (Глінка Стол.), *Ля́хы* ч. в. (Гумнішча Драг.), *Не́мцы* ўр. (Колкі Стол.), *Поля́цкэе* б. (Лунін Лун.), *Тата́рка* л. (Сітніца Лун.), *Турэ́чына* п. (Чыжэўшчына Жаб.), *Цыгано́вэ* л. (Лунін Лун.) і інш. (табл. 2).

Табліца 2. **Мікратапонімы, якія адлюстроўваюць гаспадарчую дзейнасць чалавека, яго побыт, вераванні, грамадскія адносіны**

Table 2. **Microtoponyms reflecting a person's economic activity, his way of life, beliefs, and social relations**

Падтыпы	Беларускае Паазер'е	Заходняе Палессе
1. Мікратапонімы, матываваныя тыпам, часткай паселішча	**72** (12,2 %)	**51** (10,8 %)
2. Мікратапонімы, матываваныя назвамі будынкаў жыллёвага і гаспадарчага прызначэння	**28** (4,7 %)	**27** (5,7 %)
3. Мікратапонімы, матываваныя назвамі зямельных участкаў	**218** (37 %)	**217** (46,1 %)
4. Мікратапонімы, матываваныя былым размяшчэннем прадпрыемства, установы, былым месцам промыслу, прызначэннем аб'екта	**47** (8 %)	**34** (7,2 %)
5. Мікратапонімы, суадносныя з дзеяннем, якое адбывалася на аб'екце, ці з прадметам на аб'екце	**48** (8,1 %)	**45** (9,6 %)
6. Мікратапонімы, матываваныя назвамі шляхоў зносін і мастоў	**78** (13,2 %)	**36** (7,6 %)
7. Мікратапонімы, якія адлюстроўваюць рэлігійныя вераванні, міфалогію	**45** (7,6 %)	**10** (2,1 %)
8. Мікратапонімы, матываваныя назвай прафесіі, родам заняткаў	**19** (3,2 %)	**11** (2,3 %)
9. Мікратапонімы, матываваныя назвамі сацыяльных груп і іх удзельнікаў, сацыяльных статусаў	**20** (3,4 %)	**21** (4,6 %)
10. Мікратапонімы, матываваныя этнонімамі	**15** (2,6 %)	**19** (4 %)
Усяго	**590** (100 %)	**471** (100 %)

3. Мікратапонімы, суадносныя з уласнымі імёнамі. У мікратапаніміконе Беларускага Паазер'я налічваецца 314 адзінак найменняў дадзенага тыпу, што складае 12,6 % ад агульнай колькасці мікратапонімаў рэгіёна, у мікратапаніміконе Заходняга Палесся – 335 адзінак (13,4 % ад агульнай колькасці мікратапонімаў). Гэты тып мікратапонімаў падзяляецца на два падтыпы:

1) *мікратапонімы, матываваныя антрапонімамі.*

У Беларускім Паазер'і дадзеная група мікратапонімаў прадстаўлена 267 назвамі дробных геаграфічных аб'ектаў, што складае 85 % ад агульнай колькасці мікратапонімаў, суадносных з уласнымі імёнамі. У асновах такіх мікратапонімаў зафіксаваны асабовыя імёны ў поўнай форме: *Ада́маўшчына* п. (Запруддзе Глыб.), *Аляксе́яўка* ўр. (Сценкі Докш.), *Андрэ́еўшчына* сж. (Абухава Беш.), *Архі́паўшчына* ўр. (Пушкі Лёзн.), *Багданы́* п. (Мішневічы Шум.), *Іва́наўшчына* л. (Казігорка Тал.), *Рама́нава* ўр. (Сарочына Уш.), *Сяргéеўшчына* л. (Папіна Сен.), *Я́нава* п. (Чэрасы Мёр.) і інш.; асабовыя імёны ў размоўнай форме: *Гара́сімаўка* сж. (Караліно Докш.), *За Ко́сцікам* ч. в. (Хутар Дзедзіна Мёр.), *Ро́мка* ўзв. (Асада Дзедзіна Мёр.), *Я́сеўшчына* ч. в. (Параф'янава Докш.) і інш.; мянушкі: *Гале́вічыха* п. (Таўкіні Шарк.), *Гуса́к* л. (Бортнікі Глыб.), *Жако́ва* п. (Мікуліна Глыб.), *Ку́хцевіна* л. (Бортнікі Глыб.), *Рахму́сіха* п. (Бабічы Глыб.) і інш.; прозвішчы: *Бабы́шкі* п. (Рачнёва Мёр.), *Бужы́ншчына* п. (Манякова Мёр.), *Дзяткó́ўшчына* ўр. (Зазыбы Віц.), *Кісялёўшчына* п. (Запруддзе Глыб.), *Лукінчóва* ўр. (Есіпава Арш.), *Рыкуно́ўшчына* ўзв. (Новы Пагост Мёр.), *Салаўёўшчына* п. (Мярэцкія Глыб.), *Шылаёўшчына* ўр. (Зазыбы Віц.), *Ю́чкава* луг (Параф'янава Докш.) і інш.

Адантрапанімічныя назвы Заходняга Палесся налічваюць 309 адзінак (92 % ад агульнай колькасці дадзенага тыпу мікратапонімаў). Матывавальнай асновай тут паслужылі асабовыя імёны ў поўнай форме: *Анто́новка* ўр. (Хмелева Кам.), *Боры́совка* п. (Галоўчыцы Драг.), *Мака́рувшчына* ўр. (Дзмітравічы Кам.), *Па́влово* ч. в. (Дарапеевічы Малар.), *Пытры́вкы* сж. (Галоўчыцы Драг.), *Рама́наўка* п. (Гошчава Івац.) і інш.; асабовыя імёны ў размоўнай форме: *Бро́ньское* п. (Імянін Драг.), *Гры́цікова* сж. (Сіманавічы Драг.), *Дмы́трык* п. (Ланская Малар.), *Міхалко́во* ўр. (Колбікі Стол.), *Саўчуко́ва* ч. в. (Лука Стол.), *Ю́рковэ* л. (Сялец Бяроз.) і інш.; мянушкі: *Камчэ́й* л. (Сень-

кавічы Івац.); прозвішчы: *Баку́н* ур. (Чухава Пін.), *Банко́вськэ* л. (Суткі Драг.), *Бурачо́ўшчына* п. (Какорыца Драг.), *Вышне́вськэ* п. (Аляксеевічы Драг.), *Гы́рново* сж. (Бастынь Лун.), *Жыгуны́* ч. в. (Сычы Драг.), *Кру́па* сж. (Намакрава Лун.), *Рыпыхы́* ч. в. (Сіманавічы Драг.), *Скырукы́* ч. в. (Сіманавічы Драг.), *Слізнёвае* л. (Сенькавічы Івац.) і інш.;

2) *мікратапонімы, матываваныя тапонімамі*.

У мікратапаніміі Беларускага Паазер'я разглядаемы падтып (47 назваў, 15 % у межах дадзенага тыпу) складаецца з наступных катэгорый дробных геаграфічных аб'ектаў: матываваныя камонімамі: *Вя́лі* ўр. (Багуцкія Мёр.), *Жму́ркава* ч. в. (Альгова Віц.), *Зу́ева* п. (Мішневічы Шум.), *Каты́* ч. в. (Каўшэлева Шарк.), *Кра́снаўка* л. (Сталюгі Леп.) і інш.; матываваныя гідронімамі: *Вя́та* п. (Рачнёва Мёр.), *Дзві́нка* луг (Падбярэззе Віц.), *Дняпро́ўка* ўр. (Харкаўка Арш.), *Забайка́лле* ч. в. (Зубава Арш.), *Захо́ціна* ўр. (Вялікае Жэжліна Леп.) і інш. Адзінкавымі прыкладамі прадстаўлены мікратапонімы, матываваныя астыонімамі: *Мадры́д* п. (Ланенка Дубр.); харонімамі: *Швейца́рыя* ўзв. (Высачаны Лёзн.); гадонімамі: *Ду́ліна* д. (Старое Сяло Віц.).

На тэрыторыі Заходняга Палесся намі адзначана 26 (8 %) назваў, матываваных камонімамі: *Бобро́віцкэ* л. каля в. Бабровічы (Выганашчы Івац.), *Брашыво́ччэ* ч. в. (Брашэвічы Драг.), *Былэ́ньскэ* л. каля в. Бялынь (Ласінскі Драг.), *Вя́до* ўр. (Бабровічы Івац.), *Ковалі́цькэ* п., дзе працавалі сяляне з вёскі Кавалікі (інфарм.) (Лумна Кам.), *Ла́хаўскае* сж. (Лахаўка Лун.) і інш.; гідронімамі: *Запры́пець* сж. (Баравікі Лун.), *Падбе́лы* п. каля Белага возера (Нівы Бяроз.), *Узла́не* ўзв. на беразе ракі Лані (Намакрава Лун.) і інш. Найменні, утвораныя ад астыонімаў, харонімаў і гадонімаў, намі не выяўлены (табл. 3).

Табліца 3. **Мікратапонімы, суадносныя з уласнымі імёнамі**

Table 3. **Microtoponyms corresponding to proper names**

Падтыпы	Беларускае Паазер'е	Заходняе Палессе
1. Мікратапонімы, матываваныя антрапонімамі	**267** (85 %)	**309** (92 %)
2. Мікратапонімы, матываваныя тапонімамі	**47** (15 %)	**26** (8 %)
Усяго	**314** (100 %)	**335** (100 %)

Высновы. Вынікі параўнальна-супастаўляльнага аналізу мікратапаніміконаў Беларускага Паазер'я і Заходняга Палесся паказваюць, што лексіка-семантычныя групы намінацый у цэлым супадаюць. Тым не менш існуе некаторае разыходжанне колькасці мікратапанімічных адзінак у межах гэтых лексіка-семантычных груп. Так, у абодвух рэгіёнах пераважаюць мікратапонімы, якія адлюстроўваюць фізіка-геаграфічныя асаблівасці мясцовасці, флору і фаўну, але ў мікратапаніміі Беларускага Паазер'я пераважаюць назвы, якія адлюстроўваюць асаблівасці рэльефу, а ў мікратапаніміі Заходняга Палесся – фларыстычныя назвы, што сведчыць аб істотнай розніцы прыродных умоў на поўначы і поўдні Беларусі. Яшчэ адной адметнай асаблівасцю з'яўляецца тое, што ў Беларускім Паазер'і сярод мікратапонімаў, якія адлюстроўваюць гаспадарчую дзейнасць чалавека, яго побыт, вераванні, грамадскія адносіны, меншы працэнт найменняў складаюць мікратапонімы, матываваныя этнонімамі, а ў Заходнім Палессі – мікратапонімы, якія адлюстроўваюць рэлігійныя вераванні, міфалогію. Невялікія адрозненні ў мікратапаніміі дадзеных рэгіёнаў абумоўлены асаблівасцямі гісторыі іх засялення, прыроды, эканомікі і гаспадаркі.

Спіс скарачэнняў

Раёны: Арш. – Аршанскі, Беш. – Бешанковіцкі, Брасл. – Браслаўскі, В.-Дзв. – Верхнядзвінскі, Віц. – Віцебскі, Гарад. – Гарадоцкі, Глыб. – Глыбоцкі, Докш. – Докшыцкі, Дубр. – Дубровенскі, Леп. – Лепельскі, Лёзн. – Лёзненскі, Мёр. – Мёрскі, Паст. – Пастаўскі, Пол. – Полацкі, Рас. – Расонскі, Сен. – Сенненскі, Тал. – Талачынскі, Уш. – Ушацкі, Чаш. – Чашніцкі, Шум. – Шумілінскі; Брэсц. – Брэсцкі, Бяроз. – Бярозаўскі, Драг. – Драгічынскі, Жаб. – Жабінкаўскі, Ів. – Іванаўскі, Івац. – Івацэвіцкі, Кам. – Камянецкі, Кобр. – Кобрынскі, Лун. – Лунінецкі, Малар. – Маларыцкі, Пін. – Пінскі, Пруж. – Пружанскі, Стол. – Столінскі; *аб'екты:* б. – балота, в. – вёска, воз. – возера, д. – дарога, кр. – крыніца, л. – лес, п. – поле, р. – рака, руч. – ручай, с. – сад, саж. – сажалка, сж. – сенажаць, узв. – узвышша, ур. – урочышча, ч. в. – частка вёскі; *іншае:* інфарм. – інфарматар, ч. – частка.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Адамовіч, Я. М. Мікратапанімічныя назвы / Я. М. Адамовіч. – Мн.: Выш. шк., 1971. – 112 с.

2. Капылоў, І. Л. Мікратапанімія Беларускага Паазер'я як важная крыніца гісторыка-культурнага ландшафту рэгіёна / І. Л. Капылоў // Региональная ономастика: проблемы и перспективы исследования: сб. науч. ст. / Витеб. гос. ун-т; под науч. ред. А. М. Мезенко. – Витебск, 2018. – С. 96–99.

3. Полесье. Материальная культура / В. К. Бондарчик, И. Н. Браим, Н. И. Бураковская [и др.]; редкол.: В. К. Бондарчик [и др.]. – Киев: Наук. думка, 1988. – 446 с.

4. Якубук, Н. Р. Мікратапонімы Брэстчыны, матываваныя земляробчай лексікай / Н. Р. Якубук, В. Янусік // Актуальныя праблемы мовазнаўства і лінгвадыдактыкі: зб. навук. арт.: у 2 ч. / Брэсц. дзярж. ун-т. – Брэст, 2012. – Ч. 2. – С. 184–187.

References

1. Adamovich Y. M. *Microtoponymic names.* Minsk, Vysheishaya shkola Publ., 1971. 112 p. (in Belarusian).

2. Kapylou I. L. Microtoponymy of the Belarusian Poozerie as an important source of the historical and cultural landscape of the region. *Regional'naya onomastika: problemy i perspektivy issledovaniya: sbornik nauchykh statei* [Regional onomastics: problems and research prospects: collection of scientific articles]. Vitebsk, 2018, pp. 96–99 (in Belarusian).

3. Bondarchik V. K., Braim I. N., Burakovskaya N. I. [et al.]. *Polesie. Material culture.* Kiev, Naukova dumka Publ., 1988. 448 p. (in Russian).

4. Yakubuk N. R., Yanusik V. Microtoponyms of the Brest region, motivated by agricultural vocabulary. *Aktual'nyya prablemy movaznaўstva i lingvadydaktyki: zbornik navukovykh artykulau* [Current problems of linguistics and language didactics: collection of scientific articles]. Brest, 2012, pt. 2, pp. 184–187 (in Belarusian).

Информация об авторе

Радюль Ольга Юрьевна – аспирант. Витебский государственный университет имени П. М. Машерова (Московский проспект, 33, 210038, Витебск, Республика Беларусь). E-mail: letoshneva33@mail.ru

Information about the author

Volha Yu. Radziul – Postgraduate student. Vitebsk State University named after P. M. Masherov (33 Moskovskiy Ave., Vitebsk 210038, Belarus). E-mail: letoshneva33@mail.ru

ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)

МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА, ЭТНАГРАФІЯ, ФАЛЬКЛОР

ART HISTORY, ETHNOGRAPHY, FOLKLORE

УДК 39:77.033:728.1(476)
https://doi.org/10.29235/2524-2369-2026-71-4-312-322

Паступіў у рэдакцыю 06.04.2026
Received 06.04.2026

А. М. Нароўская

Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры
Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск, Беларусь

ЭТНАГРАФІЧНАЯ ФАТАГРАФІЯ ЯК МЕТАД ДАСЛЕДАВАННЯ ТРАДЫЦЫЙНАГА ЖЫЛЛЯ БЕЛАРУСАЎ (ПА МАТЭРЫЯЛАХ ФОТААРХІВАЎ)

Аннотация. Статья посвящена анализу этнографической фотографии как метода исследования традиционного жилища. Автор рассматривает эволюцию визуальной фиксации жилища в конце XIX – начале XXI в. Предлагается авторская периодизация этапов развития этнографической фотографии, прослеживается история формирования музейных фотоархивов как основополагающих источников для изучения материальной культуры этноса. Рассматривается трансформация экспедиционной методологии от первых попыток визуальной документации к систематизированной научной фиксации традиционного жилища белорусов. На основе анализа архивных материалов музеев и фотоархива Института искусствоведения, этнографии и фольклора НАН Беларуси раскрывается роль фотографии как средства семиотического моделирования внутреннего пространства жилища. Рассматривается, как систематизация экспедиционных фотографий в музеях преобразовала их из разрозненных свидетельств в структурированные фотоархивы, позволяющие современным исследователям реконструировать эволюцию традиционного жилища, его пространственную организацию в культурные смыслы.

Ключевые слова: этнографическая фотография, традиционное жилище, музей, фотоархив, музейные коллекции

Для цитирования: Нароўская, А. М. Этнаграфічная фатаграфія як метад даследавання традыцыйнага жылля беларусаў (па матэрыялах фотаархіваў) / А. М. Нароўская // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. – 2026. – Т. 71, № 4. – С. 312–322. https://doi.org/10.29235/2524-2369-2026-71-4-312-322

Ala N. Narouskaya

Center for the Belarusian Culture, Language and Literature researches of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus

ETHNOGRAPHIC PHOTOGRAPHY AS A METHOD OF RESEARCHING THE TRADITIONAL DWELLING OF BELARUSIANS(BASED ON PHOTO ARCHIVE MATERIALS)

Abstract. This article analyzes ethnographic photography as a method for studying traditional dwellings. The author examines the evolution of visual recording of dwellings from the late 19th to early 21st centuries. The paper offers a periodization of the development of ethnographic photography and traces the history of the formation of museum photo archives as fundamental sources for studying the material culture of an ethnic group. The transformation of the expeditionary method from the first attempts at visual documentation to the systematic scientific recording of the traditional Belarusian dwelling is analyzed. Based on an analysis of archival materials from museums and the photo archive of the Institute of Art History, Ethnography, and Folklore of the National Academy of Sciences of Belarus, the role of photography as a means of semiotic modeling of the interior space of a dwelling is revealed. The article demonstrates how museum systematization transformed expeditionary photographs into structured museum photo archives, allowing contemporary researchers to reconstruct the spatial representations and social characteristics of the traditional dwelling.

Keywords: ethnographic photography, traditional dwelling, museum, photo archive, museum collections

For citation: Narouskaya A. N. Ethnographic photography as a method of researching the traditional dwelling of belarusians (based on photo archive materials). *Vestsi Natsyyanal'nai akademii navuk Belarusi. Seryia humanitarnykh navuk = Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus. Humanitarian Series,* 2026, vol. 71, no. 4, pp. 312–322 (in Belarusian). https://doi.org/10.29235/2524-2369-2026-71-4-312-322

© Нароўская А. М., 2026

Уводзіны. Этнаграфічная фатаграфія з'яўляецца ключавым кампанентам музейных і архіўных фондаў. Такія фотаздымкі змяшчаюць унікальную інфармацыю аб матэрыяльнай і нематэрыяльнай культуры, якую немагчыма цалкам атрымаць з рукапісных крыніц. У кантэксце этнаграфіі любая фатаграфія, зробленая з мэтай наступнага навуковага аналізу, адразу становіцца навуковай крыніцай.

Актуальнасць дадзенага даследавання абумоўлена неабходнасцю пераасэнсавання ролі візуальных крыніц у этнаграфічнай навуцы. У перыяд урбанізацыі і страты помнікаў традыцыйнай архітэктуры фатаграфія XIX–XX стст. становіцца важнай крыніцай па даследаванні матэрыяльнай культуры, у тым ліку традыцыйнага жылля беларусаў.

Сёння існуе праблема фрагментарнасці і распыленасці архіўных крыніц. Этнаграфічныя фатаграфіі па традыцыйным жыллі размеркаваны па мноcтве разрозненых беларускіх і замежных архіваў (напрыклад, Кунсткамера, РЭМ, РГТ). Адсутнасць адзінай каталагізацыі і доступу да архіваў ускладняе комплексны аналіз традыцыйнага жылля. Правядзенне кампаратыўнага аналізу здымкаў з розных архіваў, зробленых у час шматлікіх экспедыцый, дазволіць верыфікаваць этнаграфічныя даныя, выявіць рэгіянальныя асаблівасці і запоўніць "пустыя лакуны" асобных фотакалекцый. Сучасная этнасеміётыка прапануе пераход ад назапашвання этнаграфічных візуальных крыніц да іх інтэрпрэтацыі. Даследаванне этнаграфічнай фатаграфіі як знакавай сістэмы дасць магчымасць не толькі рэканструяваць традыцыйнае жыллё, але "прачытаць" яго невербальныя аспекты. Мэта даследавання – выявіць інфармацыйны патэнцыял этнаграфічнай фатаграфіі як рэпрэзентатыўнай крыніцы па гісторыі архітэктурна-прасторавай арганізацыі традыцыйнага жылля, які дазволіць верыфікаваць і дапоўніць этнаграфічныя апісанні XIX – пачатку XX ст.

Асноўная частка. Фатаграфія як крыніца фіксацыі і перадачы этнаграфічнай інфармацыі традыцыйна прыцягвае ўвагу спецыялістаў па этналогіі і антрапалогіі. Выкарыстанне візуальных даных у антрапалагічных і этнаграфічных даследаваннях стала тэмай работ замежных і савецкіх этнографаў з 1960-х гг. У работах даследчыкаў, апублікаваных у 1960–1970-я гг., былі вызначаны крытэрыі адбору фотакрыніц у асноўны фонд музея, распрацавана сістэма прыватных класіфікатараў па відавой прыкмеце, фотажанрах, матэрыяле і тэхніцы каталагізацыі. Важнае значэнне для даследавання мае публікацыя Г. Г. Громава "Методыка этнаграфічных экспедыцый" (1966), у якой падрабязна разглядаецца методыка этнаграфічнай фатаграфіі. Аўтар дае парады, як праводзіць фотаздымкі ў этнаграфічных экспедыцыях. Г. Г. Громаў разглядае пытанне выкарыстання маштабных прадметаў, апісвае прымальныя для здымак умовы надвор'я, пералічвае найбольш распаўсюджаныя тэмы і прадметы фіксацыі [1, с. 38–39]. З 1970-х гг. у замежных даследаваннях узрастае цікавасць да старых фотаматэрыялаў, якія захоўваюцца ў архівах і музеях. Звесткі па вывучэнні этнаграфічнай фатаграфіі архіваў можна знайсці ў зборніку артыкулаў "Антрапалогія і фатаграфія 1860–1920" [2]. Увядзенне фотадакументаў у навуковы ўжытак у канцы XX – пачатку XXI ст. звязана з фарміраваннем новых уяўленняў аб «візуальнасці» ў гуманітарных навуках. Доўгі час візуальным крыніцам адводзілася толькі ілюстрацыйная функцыя, бо галоўнае месца ў гістарычных даследаваннях займалі пісьмовыя крыніцы. Таму ўзнікла задача распрацоўкі тэарэтычнай асновы вывучэння фатаграфіі.

Важнае значэнне мае таксама даследаванне Р. А. Абілавай аб фотадакументах у музейных калекцыях XXI ст. Аўтар прадстаўляе асноўныя напрамкі крыніцазнаўчай работы з фотадакументамі ў межах іх тэматычнай разнастайнасці, асобную ўвагу надае этнаграфічным фатаграфіям [3, с. 288–289]. Цікавым з'яўляецца артыкул А. С. Собалевай, у якім аўтар раскрывае патэнцыял тэматычных фотакомплексаў, а не асобных кадраў. Адметнае месца ў артыкуле займае даследаванне этнаграфічных фотакомплексаў [4, с. 190–195]. У далейшым гэта ідэя была распрацавана ў дысертацыі К. Б. Талмачовай, дзе яна вылучыла тры тыпы этнаграфічных фотаздымкаў: 1) навуковая этнаграфічная фатаграфія; 2) навуковая фатаграфія сумежных навук. Гэта здымкі, зробленыя, напрыклад, археолагамі, якія могуць быць карысныя этнографу, але яны не з'яўляліся асноўнай мэтай даследавання; 3) фатаграфіі з этнаграфічным сюжэтам, часцей аматарскія здымкі традыцыйнага жылля [5].

Такім чынам, сучасныя падыходы да візуальнай фіксацыі этнаграфічных даных грунтуюцца на глыбокай прапрацоўцы метадалогіі, якая датычыцца як тэхнічнай дакладнасці, так і кантэкстуальнай значнасці здымка. Аднак каб зразумець эвалюцыю гэтых патрабаванняў, неабходна рэтраспектыўна прааналізаваць вытокі палявой фатаграфічна-этнаграфічнай практыкі.

Перыядызацыя. Аналіз гістарыяграфіі паказаў, што візуальныя крыніцы часта разглядаліся даследчыкамі як ілюстрацыйны матэрыял без уліку храналагічнай сістэмнасці. Між тым этнаграфічная фатаграфія як інструмент пазнання і спосаб фіксацыі ў рэальнасці не была статычнай. Яна прайшла эвалюцыю, абумоўленую развіццём навуковай метадалогіі і музейнай практыкі. Перыядызацыя, распрацаваная ў Расійскім этнаграфічным музеі (РЭМ), вылучае пяць этапаў фарміравання этнаграфічных фотакалекцый (ад антрапалагічных тыпаў да прадметаў побыту) [6]. Акцэнт пры фарміраванні фотакалекцый зроблены на тыпалогіі прадметаў. У нашым даследаванні, прысвечаным этнаграфічнай фатаграфіі традыцыйнага жылля, – акцэнт зроблены на тыпалогіі прасторавых структур. У сувязі з гэтым прапануем перыядызацыю, якая складаецца з чатырох этапаў фарміравання фотакалекцый традыцыйнага жылля ў фондах музеяў і фотаархіве Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі (ІМЭФ).

Першы этап – перыяд фотафіксацыі і дакументавання традыцыйнага жылля (канец XIX ст. – 1917 г.). Гэты перыяд звязаны з комплекснымі этнаграфічнымі экспедыцыямі, арганізаванымі Імператарскім Рускім Геаграфічным Таварыствам. Для гэтага перыяду характэрна: 1) фіксацыя традыцыйнага жылля як цэласнай сістэмы; 2) фіксацыя тыпаў жылля і гаспадарчых пабудоў; 3) інтэр'ер здымаўся рэдка, што было звязана з тэхналагічнымі абмежаваннямі. Першы этап звязаны з дзейнасцю этнографаў-даследчыкаў, якія ўмелі абыходзіцца з фотакамерай. Гэта фатаграфіі, зробленыя ў 1902–1910-х гг. у беларускіх вёсках захавальнікам музея М. М. Магілянскім, этнографамі Ф. К. Волкавым, Я. А. Ляцкім, [6], А. К. Сержпутоўскім [7, арк. 10–10 адв.], В. К. Косткам [8, арк. 23]. У 1911–1912 гг. падчас навуковых экспедыцый па Беларусі этнограф І. А. Сербаў стварае серыю фотаздымкаў традыцыйнага жылля і гаспадарчых пабудоў, вулічных планіровак [9]. Этнаграфічныя экспедыцыі праходзілі па заданні Паўночна-Заходняга аддзела Імператарскага Рускага Геаграфічнага Таварыства ў Вільні.

Другі этап – акадэмічны (1920–1950-я гг.). У гэты час этнаграфічная фатаграфія канчаткова інтэгруецца ў структуру навуковага тэксту. Фундаментальныя працы Н. І. Лебедзевай [10], А. Харузіна [11] дэманструюць новы падыход. Фатаграфія традыцыйнага жылля становіцца не проста фіксацыяй архітэктурнай формы. Жылыя і гаспадарчыя пабудовы становяцца аб'ектам сістэмнага фатаграфавання. З'яўляюцца планы, чарцяжы, дэталёвыя здымкі інтэр'ераў. Калі ў працах 1920-х гг. этнаграфічная фатаграфія выступае ў ролі палявога сведчання, то да 1950-х гг. яна ператвараецца ў інструмент навуковай класіфікацыі. Асобна можна вылучыць манаграфію Е. Э. Бломквіст (1956 г.) [12]. Этнограф выкарыстоўвае фатаграфію як сродак параўнальнага аналізу відаў жылля і тыпаў планіроўкі і прапануе тыпалагічную класіфікацыю ўсходнеславянскага традыцыйнага жылля. У працах Я. Бломквіст візуальны матэрыял з'яўляецца візуальным кодам, дзе кожная фатаграфія служыць пацвярджэннем выяўленай даследчыкам заканамернасці. Трэба адзначыць, што на гэтым этапе фатаграфія адыходзіць ад унікальнасці і дапамагае даследаваць тыпалогію жылля. Інтэр'ер становіцца важным для дэманстрацыі зместу сацыяльнага жыцця, але яго сакральны аспект часта ігнаруецца.

Трэці этап – перыяд архітэктурнай рэстаўрацыі і музеефікацыі помнікаў дряўлянага дойлідства (1960–1980-я гг.). У гэты перыяд функцыя фатаграфіі мяняецца. Яна становіцца інструментам выратавання помнікаў драўлянага дойлідства. Ствараюцца музеі пад адкрытым небам (Строчыца, Заслаўе) і фотаздымкі пачынаюць абслугоўваць патрэбы рэстаўрацыі. Традыцыйнае жыллё здымаецца з выкарыстаннем маштабных лінеек. Фатаграфуецца не толькі агульны выгляд традыцыйнага жылля, але і канструктыўныя дэталі: шчыты, замкі вянкоў, канструкцыі мацавання крокваў, трамы, вільчыкі і інш. На гэтым этапе адбываецца рэзкі рост зацікаўленасці інтэр'ерам традыцыйнага жылля. Часта ў фатаграфіях асноўны фокус робіцца на інтэр'еры. Для музейнай экспазіцыі неабходна была дэталёвая фіксацыя напаўнення (інвентарызацыя прадметаў: лаўкі, куфры, сталы, посуд, тканіны). Адбываецца здымка дробных артэфактаў жылля: разьбы ліштваў, клямак дзвярэй, прызбаў і інш., якія немагчыма было апісаць тэкстам. Фатаграфія становіцца адначасова інструментам каталагізацыі і рэстаўрацыі. Найбольшая колькасць фатаграфій

традыцыйнага жылля з этнаграфічных экспедыцый гэтага перыяду размяшчаецца ў манаграфіях А. І. Лакоткі [13] і С. А. Сергачова [14].

Чацвёрты этап – этап актуалізацыі і рэтраспектыўнага аналізу архіўнай спадчыны (1990 гг. – да сённяшняга часу). Гэта час "вяртання" забытых экспедыцый, матэрыялы аб якіх захоўваюцца ў архівах. Вызначаны этап прынцыпова адрозніваецца тым, што сучасныя даследчыкі не проста выкарыстоўваюць фатаграфіі як ілюстрацыі, яны праводзяць комплексную працу па дэшыфроўцы архіўнага фонду. Калі на першым этапе (1920–1950-я гг.) фатаграфія з'яўлялася часткай манаграфій, то ў XXI ст. яна становіцца самастойным аб'ектам вывучэння. Важным даследаваннем такога напрамку з'яўляецца альбом В. А. Лабачэўскай [15], у якім упершыню апублікавана 442 фатаграфіі этнографа І. А. Сербава, якія захоўваюцца ў аддзеле рукапісаў Бібліятэкі Вільнюскага ўніверсітэта і Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі. Найбольш знакавым даследаваннем ІМЭФ НАН Беларусі па этнаграфічнай фатаграфіі з'яўляецца манаграфія С. У. Грунтова [16], прысвечаная этнаграфічнай экспедыцыі 1923 г. Аснову манаграфіі складаюць 59 фотаздымкаў (з іх 32 – выявы жылых і гаспадарчых пабудоў, планіроўкі вуліц), якія захоўваюцца ў фондах Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь. Манаграфіі даследчыкаў сведчаць аб тым, што візуальны патэнцыял архіўных матэрыялаў пачатку XX ст. толькі пачынае даследавацца.

Важным аспектам чацвёртага этапу з'яўляецца перавод фондаў і архіваў у лічбавы фармат, які дазваляе ўжываць метады камп'ютарнага мадэлявання і семіятычнага аналізу этнаграфічна-фатаграфічнай спадчыны. Прапанаваная перыядызацыя дазваляе не толькі ўпарадкаваць візуальны матэрыял, але і вызначыць прынцыпы фарміравання асноўных музейных і архіўных калекцый этнаграфічнай фатаграфіі. Фарміраванне этнаграфічных фотакалекцый было цесна звязана з развіццём палявой этнаграфічнай практыкі, якая трансфармавала жыллё з аб'екта візуальнага назірання ў аб'ект навуковай фіксацыі. Для разумення гэтага працэсу неабходна звярнуцца да вытокаў: прасачыць, як змяняліся падыходы этнографаў да здымкі традыцыйнага жылля на працягу больш за стагоддзе – ад першых этнаграфічных фатаграфій канца XIX ст. да сучасных метадаў каталагізацыі і аналізу візуальнай спадчыны.

У канцы XIX – пачатку XX ст. этнаграфічная фатаграфія толькі пачынае ўваходзіць у этнаграфічную практыку, фіксацыя часта вялася ў рамках маштабных экспедыцый, арганізаваных Імператарскім Рускім Геаграфічным Таварыствам. У гэты час фатаграфія разглядалася як найважнейшы інструмент для стварэння этнаграфічных калекцый і каталогаў матэрыяльнай культуры. Першыя фатаграфіі традыцыйнага жылля, зробленыя ў час этнаграфічных экспедыцый, мелі дакументальны і апісальны характар. Яны абмяжоўваліся вонкавым аналізам крыніц. Этнографы ў сваіх справаздачах прыводзілі атрыбутыўныя даныя, указвалі месца і час здымкі, месца захоўвання, памер, дату. У гэты ж час этнографы і фатографы пачынаюць распрацоўваць строгія методыкі фатаграфіі традыцыйнага жылля – гэта фіксацыя фасадаў і тарцовых сценак жылля, фотаздымка інтэр'ераў, прывязка да мясцовасці, прапорцыі і інш.

Даследчыкаў, якія займаліся распрацоўкай метадаў і зборам этнаграфічнай фатаграфіі традыцыйнага жылля, можна падзяліць на тых, хто заклаў асновы стандартызацыі, і тых, хто паглыбіў метадалогію аналізу. Неабходна адзначыць, што каштоўнасць фатаграфічнай крыніцы напрамую залежыць ад метадалогіі яе стварэння. Каб здымак з фотаархіва стаў надзейным навуковым дакументам, неабходна разумець, якімі прынцыпамі кіраваўся этнограф на этапе палявой працы. Адным з такіх этнографаў, які распрацаваў методыку збору і сабраў калекцыю фатаграфій традыцыйнага жылля беларусаў, быў супрацоўнік Этнаграфічнага аддзела Рускага музея (пазней – Расійскі этнаграфічны музей) А. К. Сержпутоўскі. Этнограф зрабіў вялікі ўклад у фарміраванне музейнага фонду па этнаграфіі, ім было сабрана 6368 прадметаў и 1460 фатаграфій [6]. У архіве Расійскага этнаграфічнага музея знаходзіцца "Кароткая праграма для збірання этнаграфічных прадметаў у Беларусі", складзеная А. К. Сержпутоўскім. У Праграме даюцца рэкамендацыі А. К. Сержпутоўскага па выяўленні адметнасцей беларускага жылля. Этнограф адзначае, што пажадана па "магчымасці рабіць карты, планы і фатаграфіі…" [17, арк. 2]. Нягледзячы на тое, што праграма кароткая, у ёй даюцца скрупулёзныя прадпісанні па даследаванні беларускага традыцыйнага жылля. Этнограф пералічвае розныя назвы паселішчаў, відаў жылля, якім падчас этнаграфічных экспедыцый трэба надаць увагу: "…Селішчы: мястэчка, сяло, вёска, выселак,

пасёлак, хутар і т. п. Планы вуліц, дарог і размяшчэнне двароў, а таксама гумнаў… Ізба (хата), святліца… варыўня, свіран, гумно, хлеў… склеп… бані (лазні … і да т. п.)" [17, арк. 5–6]. Трэба адзначыць, што важную ролю адыграў той факт, што ў пачатку XX ст. пры Этнаграфічным аддзеле Рускага музея імператара Аляксандра III (далей – РЭМ) у першай трэці XX ст. была арганізавана фоталабараторыя. У выніку этнографам музея ў пачатку XX ст. для вядзення палявой этнаграфічнай працы выдаваліся фотаапараты. У адным з лістоў, адпраўленых з экспедыцыі ў музей, навуковы супрацоўнік А. К. Сержпутоўскі пісаў: "Вялікі фатаграфічны апарат я адаслаў разам з рэчамі ў вялікай дубовай скрыні, акаванай жалезам… Маленькі апарат я пакуль пакінуў сабе" [18, арк. 42 адв. – 43]. З негатываў, якія прывозіліся з паездак, у музейнай лабараторыі друкаваліся адбіткі, да якіх іх аўтары рабілі тэкставыя апісанні, якія змяшчалі важную інфармацыю аб зафіксаваных на фатаграфіях выявах.

Пры вывучэнні дарожных сшыткаў А. К. Сержпутоўскага быў выяўлены спіс фотаздымкаў, зробленых ім у с. Лучыцы падчас экспедыцый у Мінскую губерню ў 1906 г. Складанне падобнага спісу было выклікана спецыфікай тэхналагічнага працэсу правядзення фотаздымкі ў экспедыцыйных умовах. Для захавання інфармацыі аб знятых кадрах існавала неабходнасць у іх пісьмовым уліку. У якасці носьбіта фатаграфічнай інфармацыі А. К. Сержпутоўскі выкарыстоўваў шкляныя пласцінкі, пакрытыя эмульсійным пластом. Яны транспартаваліся ў адмысловых касетах, і таму этнограф быў змушаны прастаўляць іх нумарацыю і ўказваць назву аб'ектаў. Такі падыход дазваляў пазбегнуць узнікнення блытаніны пры наступнай ідэнтыфікацыі палявога матэрыялу (мал. 1). У рукапісным архіве РЭМ прадстаўлена справаздача А. К. Сержпутоўскага Этнаграфічнаму аддзелу (ад 1 снежня 1924 г.) аб экспедыцыі ў Мінскую і Магілёўскую губерні. Аналіз матэрыялаў справаздачы паказаў, што у спісе змяшчаецца 47 фатаграфій, зробленых этнографам у час экспедыцыі [9, арк. 10–10 адв.]. З вопісу аўтар артыкула выпісала толькі назвы фотаздымкаў, звязаных з відамі вёсак, жылых і гаспадарчых памяшканняў, прадметаў унутранага абсталявання: "хутор", "хата новая – изба новая", "поветка і імбар – навес и амбары", "хлеў і свінушнік – сараи", "сядзіба – усадьба", "ёўня", "імбар – амбар", "хата – изба", "печ – печь"



Мал. 1. Выгляд сялянскай сядзібы, в. Заполле, Мазырскі павет, Мінская губерня.
Фота А. К. Сержпутоўскага, 1906 г. РЭМ 1013-29

Fig 1. View of a peasant estate, Zapolye village, Mozyr district, Minsk province.
Photo by A. K. Serzhputovsky, 1906. REM 1013-29

(с. Сова, в. Ермакі Горацкага пав. Магілёўскай губ.). Усе фатаграфіі маюць нумар, пад якім яны былі зарэгістраваны.

У рукапісным архіве РЭМ у іншай справаздачы этнографа аўтарам быў зафіксаваны другі спіс з 62 фотаздымкамі, якія былі зроблены А. К. Сержпутоўскім па даручэнні Этнаграфічнага аддзела ГРМ у 1925 г. У справаздачы прыводзіцца наступны спіс фотаздымкаў "хата" (м. Вызна, в. Жываглодавічы, х. Крычын), "постройка хаты", "хлев и свинух", "хлев – конюшня", "хлев", "постройка хлева", "истопка или варивня", "видлярня – коптильня" [9, арк. 12–12 адв.]. Дзякуючы таму, што даследчык дэталёва фіксаваў звесткі пра выгляд сядзіб, рабіў фотаздымкі з розных ракурсаў, яны набылі дакументальнае навуковае значэнне. Значную каштоўнасць уяўляюць фатаграфіі супрацоўніка РЭМ В. К. Косткі, зробленыя ў час экспедыцый. Этнограф зрабіў унікальную серыю фотаздымкаў, куды ўвайшлі розныя віды жылых і гаспадарчых пабудоў, двароў, агульных планаў паселішчаў Мінскай і Магілёўскай губерняў. Напрыклад, цікавым узорам з'яўляецца фатаграфія галоўнай вуліцы в. Любячка Ігуменскага пав. Мінскай губ., на якой даецца агульная планіроўка вёскі, добра зафіксаваны малыя архітэктурныя формы, франтоны, адлегласць паміж дамамі. На фотаздымках з выявамі жылых пабудоў беднага і багатага селяніна (в. Парэчча Ігуменскага пав. Мінскай губ.) увага сфакусіравана на канструкцыйных асаблівасцях жылля розных сацыяльных груп насельніцтва [8] (мал. 2).

Музейныя вопісы змяшчаюць інфармацыю аб населеных пунктах, якія з мая па жнівень 1905 г. наведваў В. К. Костка: Вяззе, Жарабковічы, Міластава, Шчыткавічы, Падліпцы, Парэчча Слуцкага і Ігуменскага паветаў. Гэта інфармацыя і фатаграфіі этнографа даюць магчымасць вызначыць арэал распаўсюджвання тых альбо іншых планіровак жылля.

Паводле звестак сайта архіў РЭМ налічвае каля 180 тыс. адзінак захоўвання (негатываў і пазітываў), якія ахопліваюць перыяд з сярэдзіны 40-х гг. XIX ст. да сённяшняга часу. Дарэвалюцыйныя калекцыі налічваюць каля 50 тыс. фотаздымкаў. Гэта ўнікальныя візуальныя сведчанні, якія захавалі ландшафт, селішчы, жыллё, хатнія заняткі і рамёствы, нацыянальны беларускі строй. Архіў змяшчае працы і фотаздымкі такіх вядомых этнографаў, як Я. Ф. Карскі, У. М. Дабравольскі,



Мал. 2. Хата старасты, в. Вялікія Заходы, Горацкі павет, Магілёўская губерня.
Фотакалекцыя РЭМ 761-20. Фота В. К. Косткі, 1903–1904 гг.

Fig. 2. The village headman's dwelling. Bol'shiye Zakhody village, Gorki district, Mogilev province.
REM photo collection 761-20. Photo by V. K. Kostko, 1903–1904

А. К. Сержпутоўскі, В. К. Костка, Б. А. Рыбакоў, А. В. Лысенка і інш. Такім чынам, фонды Расійскага этнаграфічнага музея выключна багатыя матэрыяламі па культуры беларусаў, паколькі ў XIX – пачатку XX ст. гэты рэгіён быў зонай актыўнай навуковай цікавасці. Архіў змяшчае фатаграфіі, зробленыя ў рамках ранніх комплексных экспедыцый, калі этнографы мэтанакіравана дакументавалі тыпалогію сялянскіх сядзіб. Фотаздымкі звязаны з наступнымі тэмамі: тыпы дахаў (саламяныя, дранкавыя), размяшчэнне сядзібы (хата, хлеў, гумно і інш.), дэталі фасадаў. Архіў РЭМ, як правіла, захоўвае серыйныя здымкі (10–20 кадраў), якія паказваюць традыцыйнае жыллё ў розных ракурсах, што з'яўляецца ідэальным матэрыялам для даследавання аб'екта.

Фотаархіў ІМЭФ імя К. Крапівы НАН Беларусі. Фотаархіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі – гэта вузкаспецыялізаваны і нацыянальна арыентаваны фотаархіў, які зберагае ўнікальную інфармацыю аб матэрыяльнай культуры беларусаў, у тым ліку традыцыйным жыллі. Галоўная перавага фотаархіва ІМЭФ у тым, што ён збіраўся і працягвае папаўняцца з мэтай дакументавання этнаграфічнай спадчыны Беларусі.

Асноўны масіў фатаграфій архіва ІМЭФ – гэта канец 1940–1980-х гг. Першыя фотаздымкі традыцыйнага жылля ў фотаархіве ІМЭФ, зроблены этнографамі М. Я. Грынблатам і Л. А. Малчанавай (Любанскі р-н, 1949 г.) [19]. Назва гэтай этнаграфічнай экспедыцыі не ўказваецца ў архіўных картках. Пачынаючы з 1950-х гг. у картках-пратаколах зафіксаваны назвы наступных этнаграфічных экспедыцый: Гродзенска-Палеская экспедыцыя (1953 г.); Віцебска-Магілёўская (1955 г.), Паўднёва-беларуская (1955 г.), Мінска-Гомельская экспедыцыя (1956 г.) і інш. (мал. 3).

Фотафонд з'яўляецца выключна моцным па дакументацыі пачынаючы з 1950-х гг., калі этнаграфічныя даследаванні ў БССР былі вельмі актыўныя. У гэты перыяд вялася сістэматычная праца па фіксацыі змен у побыце насельніцтва. Этнографы фіксавалі як традыцыйныя, яшчэ не закранутыя зменамі пабудовы, так і новыя тыпы жылля, якія ўзнікалі ў 1940–1950-х гг. Фотаархіў ІМЭФ НАН Беларусі сістэматызаваны па геаграфічным і экспедыцыйным прынцыпах. Фотадакументацыя захоўваецца ў 12 драўляных каталожных скрынях. Кожная скрыня ўяўляе сабой самастойны сістэматызаваны блок (які змяшчае каля 500 картак-пратаколаў). У фотаархіве прыблізна каля 6000 тыс. фатаграфій, з іх каля 2000 тыс. фотаздымкаў традыцыйнага жылля




Мал. 3. Вяночны (круглы) двор, в. Званец, Журавіцкі р-н, Гомельская вобл.
Фота Л. А. Малчанавай, 1955 г. Віцебска-Магілёўская экспедыцыя

Fig. 3. Wreath (round) yard, Zvonets village, Zhuravitsky district, Gomel region.
Photo by L. A. Molchanova, 1955. Vitebsk-Mogilev expedition



Мал. 4. Покуць, в. Неглюбка, Веткаўскі р-н, Гомельская вобл. Фота П. Захаранка, 1965 г.

Fig. 4. Pokuts', Neglyubka village, Vetkovsky district, Gomel region. Photo by P. Zakharanka, 1965



Мал. 5. Печ, в. Рыскаў, Рагачоўскі р-н, Гомельская вобл. Фота П. Захаранка, 1965 г.

Fig. 5. Bake, Ryskov village, Rogachevsky district, Gomel region. Photo by P. Zakharanka, 1965

і яго фрагментаў, а таксама выяў гаспадарчых пабудоў. У асобнай скрыні захоўваюцца фатаграфіі прадметаў інтэр'ера традыцыйнага жылля (печ, сталы, абразы, лавы, палаці і інш.). Негатывы фотаархіва захоўваюцца асобна (мал. 4, 5).

Большая частка фатаграфій экспедыцый 1950–1960-х гг. захоўваецца ў першай каталожнай скрыні. У другой скрыні прадстаўлены фотаздымкі жылля і гаспадарчых пабудоў 1960–1970-х гг., у трэцяй – 1970–1980-х гг.

Фотаархіў цесна звязаны з палявымі этнаграфічнымі экспедыцыямі, якія праводзіліся на працягу шматлікіх дзесяцігоддзяў навуковымі супрацоўнікамі аддзела этнаграфіі ІМЭФ НАН Беларусі. Фатаграфіі прывязаны да падрабязных палявых справаздач, маюць навуковыя анатацыі, складзеныя у адпаведнасці з тагачаснымі і сучаснымі навуковымі праграмамі ІМЭФ НАН Беларусі. Для аналізу традыцыйнага жылля беларусаў (асабліва з улікам рэгіянальных адрозненняў – Заходняе і Усходняе Палессе, Панямонне, Цэнтральная Беларусь, Паазер'е і Падняпроўе) архіў ІМЭФ змяшчае больш грунтоўныя даныя, чым фотаархіў Расійскага этнаграфічнага музея.

Фотаархіў ІМЭФ утрымлівае больш фатаграфій тыпалагічных варыянтаў жылля, якія не з'яўляліся прыярытэтнымі для агульнарасійскіх музеяў. Матэрыялы, сабраныя беларускімі этнографамі, часта лепш адлюстроўваюць лакальныя асаблівасці будаўніцтва ў вызначанай вёсцы ці раёне. Калі правесці кампаратыўны аналіз з фотаархівам РЭМ, то там змяшчаюцца вельмі цікавыя раннія калекцыі (да 1920-х гг). Фотаздымкі, якія змяшчаюцца ў фотаархіве ІМЭФ, адлюстроўваюць канец 1940 – пачатак 1990-х гг. Такім чынам, фотаматэрыялы, сабраныя этнографамі РЭМ, дапамагаюць прасачыць эвалюцыю агульнай методыкі фотаздымкі праз работы буйных вучоных (канец XIX – пачатак XX ст.), а архіў ІМЭФ НАН Беларусі ўяўляе найбольш дэталізаваную калекцыю фатаграфій беларускага традыцыйнага жылля.

Фотаархіў Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту, заснаваны ў 1976 г., меў зусім іншую першасную мэту дакументацыі, чым ІМЭФ НАН Беларусі. Улічваючы, што асноўнымі задачамі музея з'яўляліся збор і музеефікацыя помнікаў драўлянага дойлідства, яго фотаархіў – самая поўная

і дэталізаваная крыніца па архітэктурных тыпах жылля. На пачатковым этапе работы музея былі праведзены дзясяткі экспедыцый, у якіх фіксаваліся даныя аб наяўнасці традыцыйнага жылля, сакральных аб'ектах, гаспадарчых і вытворчых пабудовах на тэрыторыі Беларусі. Першая этнаграфічная экспедыцыя адбылася ў 1977 г., аб чым сведчаць архіўныя матэрыялы музея [20, арк. 99–101]. На сённяшні дзень у архіве Беларускага дзяржаўнага музея народной архітэктуры і побыту (БДМНАП) захоўваецца некалькі дзясяткаў тысяч фатаграфій, а ў фондах музея – больш за 3000 негатываў. У фондах БДМНАП праведзена атрыбуцыя негатываў – усталяванне аўтарства, месца здымкі, часу і сюжэту, які ўключае візуальны аналіз, вывучэнне маркіроўкі на канвертах, прыцягненне архіўных матэрыялаў. Большая частка негатываў адлічбавана для скрупулёзнага даследавання дэталяў архітэктурнага аб'екта. У табліцы і на мал. 6 прыведзены прыклад атрыбуцыі аднаго з негатываў «негатыў "Вуліца"» з фотаархіва Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту.

Атрыбуцыйныя даныя фотанегатыва "Вуліца". Фотаархіў БДМНАП. КП 009960

Attributive data for the photo negative "Street". Photo archive of the BDMNAP. KP 009960

№ п/п	Прадметнае імя і назва, аўтар, кароткае апісанне, месца і час стварэння, матэрыял, тэхніка, памер	Ідэнтыфікацыйны нумар	Захаванасць
1	Негатыў "Вуліца"; А. І. Лакотка; змяшчае выяву вясковай вуліцы з двухбаковай забудовай. Абапал грунтовай вясковай дарогі забудаваныя сядзібы, якія павернуты тарцовымі фасадамі да вуліцы. Фасады з франтонамі, закотамі. Пераважна з двума вокнамі (з правага боку на здымку тры хаты); БССР; Гродзенская вобласць; Астравецкі раён; Спонды, вёска; 1979; фотастужка; апрацоўка хіміка-фатаграфічная (негатыўны працэс); 2,4 × 3,6	КП 009 960	1990/03/15 – на паверхні драпіны, плямы, адбіткі пальцаў, пашкоджана перфарацыя

Аналіз працэсаў камплектавання фотаархіваў выяўляе прынцыповае адрозненне ў структуры і форме дакументавання паміж навукова-даследчымі і музейнымі ўстановамі. У навукова-даследчай практыцы (напрыклад, у архівах ІМЭФ) першасная фіксацыя ажыццяўляецца ў форме каталожных картак (адзінак захоўвання), якія змяшчаюць фотавыяву і кароткую анатацыю. Гэта забяспечвае аператыўную выбарку даных. У фондах музея пад адкрытым небам фотафік-



Мал. 6. Вуліца, в. Спонды, Астравецкі р-н, Гродзенская вобл. Фотаархіў БДМНАП. КП 009960. Фота А. І. Лакоткі, 1979 г.

Fig. 6. Street, Spondy village, Ostrovets district, Grodno region. Photo archive BDMNAP. KP 009960. Fhoto A. I. Lakotka, 1979

сацыя інтэграваная ў абавязковыя экспедыцыйныя справаздачы. Гэтыя справаздачы, сшытыя па гадах або пэўных экспедыцыях, уяўляюць сабой збрашураваныя дакументальныя комплексы. У іх дэталёва фіксуюцца архітэктурныя асаблівасці (тып двара, канструкцыйныя элементы і г. д.) з непасрэдным прымацаваннем (наклейваннем) адпаведных фатаграфій у якасці ілюстрацыйнага матэрыялу. Такім чынам, сістэма захоўвання ў музеі арыентавана на цэласнасць палявога апісання, у той жа час сістэма фотаархіва ІМЭФ – на зручнасць каталагізацыі асобных аб'ектаў. Для фотаархіва ІМЭФ была характэрна фотафіксацыя этнаграфічнага кантэксту (традыцыйнае жыллё, інтэр'ер, штодзённае жыццё сялян і інш.), шмат здымкаў з людзьмі ў кадры (як носьбітаў культуры). У фотаархіве музея пад адкрытым небам адбывалася фіксацыя матэрыяльнай структуры, рабіўся акцэнт на архітэктурна-будаўнічых рашэннях, прысутнічала нізкая доля людзей у кадры.

Заключэнне. Такім чынам, фотаархівы музеяў і ІМЭФ НАН Беларусі з'яўляюцца важнай крыніцай для даследавання традыцыйнага жылля. Расійскі этнаграфічны музей змяшчае вялікую колькасць метадычна каштоўных фатаграфій, зробленых у канцы XIX – пачатаку XXI ст. У фотаархіве прысутнічае рэпрэзентатыўны корпус здымкаў традыцыйнага беларускага жылля, зафіксаваны рознымі пакаленнямі этнографаў, што дазваляе прасачыць эвалюцыю самой тэхнікі фіксацыі. Фотаархіў Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту ўдзяляе ўвагу архітэктурна-канструктыўным дэталям з мэтай захавання помніка. Акадэмічны архіў (ІМЭФ) акцэнтуе ўвагу на крыніцазнаўчай атрыбуцыі. Поўнае навуковае разуменне традыцыйнага жылля беларусаў магчыма толькі праз сінтэз будаўнічай дакументацыі, бытавой фіксацыі і метадалагічных верыфікаваных даных. Усе фотаархівы ўзаемадапаўняюць адзін аднаго і даюць найбагацейшы і дэталізаваны матэрыял па структуры і тыпалогіі самога жылля.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Громов, Г. Г. Методика этнографических экспедиций / Г. Г. Громов. – М.: Изд-во Моск. ун-та, 1966. – 107 с.
2. Anthropology and Photography 1860–1920. – London: Yale University Press in Association with the Royal Anthropological Institute, 1997. – 275 p.
3. Абилова, Р. О. Основные направления источниковедческой работы с фотодокументами из музейных коллекций в современной российской историографии / Р. О. Абилова // Филология и культура. Исторические науки. – 2015. – № 2 (40). – С. 287–292.
4. Соболева, Е. С. Иллюстративные музейные коллекции как этнографический источник (на примере индонезийского фонда МАЭ) / Е. С. Соболева // Сборник Музея антропологии и этнографии. – 2000. – Т. 48. – С. 190 – 195.
5. Толмачева, Е. Б. Фотография как этнографический источник: по материалам фотоколлекции Музея антропологии и этнографии им. Петра Великого (Кунсткамера) РАН: дис… канд. ист. наук: 07.00.07 / Толмачева Екатерина Борисовна; Музей антропологии и этнографии им. П. Великого (Кунсткамера). – СПб., 2011.– 246 с.
6. Онлайн-проект «Собрание фотографий Российского этнографического музея» // Российский этнографический музей [сайт]. – URL: https://www.ethnomuseum.ru/collections/collection/sobranie-fotografij/ (дата обращения: 11.02.2026).
7. Архіў Расійскага этнаграфічнага музея (АРЭМ). – Ф. 1. Воп. 2. Спр. 583.
8. АРЭМ. – Ф. 1. Воп. 2. Спр. 352.
9. Сербов, И. А. Поездки по Полесью в 1911 и 1912 гг. / И. А. Сербов. – Вильна: Сев.-Зап. отд. Имп. Рус. геогр. о-ва, 1914. – 51 с.
10. Лебедева, Н. И. Жилище и хозяйственные постройки Белорусской ССР: Мозырский и Бобруйский округа по левому берегу Припяти и ее притокам: материалы экспедиции 1927 г. / Н. И. Лебедева. – Вып. 1. – М., 1929. – 81 с.
11. Харузин, А. Славянское жилище в Северо-Западном крае: из материалов по истории развития славянских жилищ / А. Харузин. – Вильна: Типолитогр. Т-ва «Н. Мац и К°», 1907. – 341 с.
12. Бломквист, Е. Э. Крестьянские постройки русских, украинцев и белорусов (поселения, жилища и хозяйственные строения) / Е. Э. Бломквист // Восточнославянский этнографический сборник / [отв. ред. С. А. Токарев]. – М., 1956. – 458 с. – (Труды Института этнографии им. Н. Н. Миклухо-Маклая. Новая серия / Акад. наук СССР; т. 31).
13. Локотко, А. И. Белорусское народное зодчество: середина XIX–XX в. / А. И. Локотко. – Мн.: Навука і тэхніка, 1991. – 287 с.
14. Сергачев, С. А. Белорусское народное зодчество / С. А. Сергачев. – Мн.: Ураджай, 1992. – 255 с.
15. Беларусы ў фотаздымках Ісака Сербава. 1911–1912 = The Belarusians in the photos by Isaac Serbau = Baltarusiai Isako Serbovo metu fotografijose / склад., аўт. уступ. арт. В. А. Лабачэўская; рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн.: Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2012. – 456 с.: іл.
16. Грунтоў, С. У. Забытая экспедыцыя 1923 года: ля вытокаў акадэмічнай этнаграфіі ў Беларусі: альбом-манаграфія / С. Я. Грунтоў, Я. Грыневіч, Н. Саўчанка. – Мн.: Бел. навука, 2023. – 216 с.

17. АРЭМ. – Ф. 1. Воп. 2. Спр. 573.

18. АРЭМ. – Ф. 1. Воп. 2. Спр. 578.

19. Фотаархіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі. – Фота № 39. – Экспедыцыя ў Любанскі р-н Мінскай вобл., 1949 г.

20. Архіў Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту (БДМНАП). – Кн. 2. Справаздачы аб навуковых камандзіроўках па Рэспубліцы Беларусь (05.09.1977 – 25.12.1977).

References

1. Gromov G. G. *Methodology of ethnographic expeditions.* Moscow, University Publishing House, 1966. 107 p. (in Russian).

2. *Anthropology and Photography 1860–1920.* London, Yale University Press in Association with the Royal Anthropological Institute, 1997. 275 p.

3. Abilova R. O. The main directions of source study work with photographic documents from museum collections in modern Russian historiography. *Filologiya i kultura. Istoricheskie nauki = Philology and Culture. Historical Sciences,* 2015, no. 2 (40), pp. 287–292 (in Russian).

4. Soboleva E. S. Ilustrative museum collections as an ethnographic source (using the example of the Indonesian MAE collection). *Sbornik Muzeya antropologii i etnografii = Collection of the Museum of Anthropology and Ethnography,* 2000, vol. 48, pp. 190–195 (in Russian).

5. Tolmacheva E. B. *Photography as an ethnographic source: based on materials from the photo collection of the Peter the Great Museum of Anthropology and Ethnography (Kunstkamera) of the Russian Academy of Sciences.* Abstract of D. Sc. diss. St. Petersburg, 2011. 246 p. (in Russian).

6. *Online project "Collection of photographs of the Russian Ethnographic Museum".* Available at: https://www.ethnomuseum.ru/collections/collection/sobranie-fotografij/ (accessed 11.02.2026) (in Russian).

7. *Archives of the Russian Ethnographic Museum (AREM),* coll. 1, aids 2, fol. 583 (in Russian).

8. *Archives of the Russian Ethnographic Museum (AREM),* coll. 1, aids 2, fol. 352 (in Russian).

9. Serbov I. A. *Trips to Polesie in 1911 and 1912.* Vilna, North-West Separate Imperial Russian Geographical Islands, 1914. 51 p. (in Russian).

10. Lebedeva N. I. *Dwelling and outbuildings of the Byelorussian SSR: Mozyr and Bobruisk districts along the left bank of the Pripyat and its tributaries:* materials of the 1927 expedition, iss. 1. Moscow, 1929. 81 p. (in Russian).

11. Haruzin A. *Slavic dwellings in the Northwestern region: from materials on the history of the development of Slavic dwellings.* Vilna, Typographical Society of N. Mats and Co., 1907. 341 p. (in Russian).

12. Blomkvist E. E. Peasant buildings of Russians, Ukrainians and Belarusians (settlements, dwellings and farm buildings). *Vostochnoslavyanskij etnograficheskij sbornik = East Slavic Ethnographic Collection.* Proceedings of the N. N. Miklouho-Maclay Institute of Ethnography. New Series. USSR Academy of Sciences. Moscow, 1956, vol. 31. 458 p. (in Russian).

13. Lokotko A. I. *Belarusian folk architecture: Mid 19th – 20th centuries*. Minsk, Navuka i technika Publ., 1991. 287 p. (in Russian).

14. Sergachev S. A. *Belarusian folk architecture.* Minsk, Uradjai Publ., 1992. 255 p. (in Russian).

15. Labacheŭskaya V. A. (ed). *The Belarusians in the photos by Isaac Serbau = Baltarusiai Isako Serbovo metu fotografijose.* Minsk, Belarus. Encycl. Name P. Brovka Publ., 2012. 456 p. (in Belarusian).

16. Gruntoŭ S. U. *Forgotten expedition of 1923: for the release of academic ethnography in Belarus: album-manography.* Minsk, Belaruskaya Navuka Publ., 2023. 216 p. (in Belarusian).

17. *Archives of the Russian Ethnographic Museum (AREM),* coll. 1, aids 2, fol. 573 (in Russian).

18. *Archives of the Russian Ethnographic Museum (AREM),* coll. 1, aids 2, fol. 578 (in Russian).

19. *Photo archives of the Institute of Cultural Studies, Ethnagraphy and Folklore of the National Academy of Sciences of Belarus.* Photo no. 39. Expeditions in Lyuban district, Minsk region, 1949 (in Russian).

20. *Archives of the Belarusian State Museum of Folk Architecture and Life.* Book 2. Information on scientific trips to the Republic of Belarus (05.09.1977 – 25.12.1977) (in Belarusian).

Информация об авторе

Наровская Алла Николаевна – кандидат исторических наук, доцент. Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы, Национальная академия наук Беларуси (ул. Сурганова 1, корп. 2, 220072, Минск, Республика Беларусь). E-mail: anarovskaya@gmail.com. https://orcid.org/0009-0005-9066-5149

Information about the author

Alla N. Narouskaya – Ph. D. (Hist.), Associate Professor. Center for the Belarusian Culture, Language and Literature researches of the National Academy of Sciences of Belarus (1 Surganova Str., Bldg 2, Minsk 220072, Belarus). E-mail: anarovskaya@gmail.com. https://orcid.org/0009-0005-9066-5149

ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)

ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА

LITERARY SCIENCE

УДК 821.161.3-311.6’06.09
https://doi.org/10.29235/2524-2369-2026-71-4-323-331

Паступіў у рэдакцыю 01.06.2026
Received 01.06.2026

Л. Г. Дуктава

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь

РЭПРЭЗЕНТАЦЫЯ ЖАНОЧЫХ ВОБРАЗАЎ У СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ПРОЗЕ ПРЫ АДЛЮСТРАВАННІ ТЭМЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

Аннотация. Рассматриваются особенности репрезентации женских образов в прозе белорусских писателей трех поколений, отражающих тему Великой Отечественной войны. В эпических произведениях В. Быкова, И. Чигринова, В. Гниломедова, Е. Браво, М. Познякова созданы выдающиеся женские образы, с помощью которых многогранно проявляются черты национального характера: мужество, преданность родной земле, самопожертвование, милосердие, трудолюбие. Анализируются особенности репрезентации образа женщины в произведениях белорусских писателей, принимавших участие в боевых действиях в Великой Отечественной войне, на примере образа Франи в рассказе В. Быкова «Полюби меня, солдатик». Раскрывается специфика восприятия женских образов в романах писателей поколения «детей войны» И. Чигринова, В. Гниломедова; прослеживаются особенности изображения женщин на войне в романном цикле И. Чигринова; показаны традиции и новаторство в изображении дендрологических образов, имеющих женское начало, в эпических произведениях писателей разных поколений; охарактеризован потенциал в рецепции образа женщины в творчестве писателей – представителей наследников поколения победителей с учетом новой литературной ситуации в изображении темы Великой Отечественной войны.

Ключевые слова: военная проза, женский образ, эпическое произведение, Е. Браво, В. Быков, И. Чигринов

Для цитирования: Дуктава, Л. Г. Рэпрэзентацыя жаночых вобразаў у сучаснай беларускай прозе пры адлюстраванні тэмы Вялікай Айчыннай вайны / Л. Г. Дуктава // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. – 2026. – Т. 71, № 4. – С. 323–331. https://doi.org/10.29235/2524-2369-2026-71-4-323-331

Liubou G. Duktava

Belarusian State University, Minsk, Belarus

REPRESENTATION OF FEMALE IMAGES IN MODERN BELARUSIAN PROSE WHEN ILLUSTRATING THE THEME OF THE GREAT PATRIOTIC WAR

Abstract. The article examines the features of the representation of female images in the prose of writers of three generations who reflect the theme of the Great Patriotic War. The epic works of V. Bykau, I. Chygrinau, U. Gnilomedau, E. Brava, and M. Paznyakou create outstanding female images, with the help of which the multifaceted traits of the national character are shown: courage, devotion to the native land, self-sacrifice, mercy, and hard work. The paper highlights the features of the depiction of women in the works of Belarusian writers who participated in the hostilities of the Great Patriotic War, focusing on the consideration of the image of Frani in the story “Love Me, Soldier” by V. Bykau; the specifics of the reception of female images in the novels of writers of the generation of “children of war” I. Chigrynau, U. Gnilamedau are revealed, the features of the depiction of women in war within the novel cycle of I. Chigrynau are traced; traditions and innovations in the depiction of dendrological images that have a female origin in the epic works of writers of different generations are revealed; the potential in the representation of female images in the work of writers – representatives of the descendants of the generation of winners is characterized, taking into account the new literary situation in the depiction of the theme of the Great Patriotic War.

Keywords: military prose, female image, an epic work, E. Brava, V. Bykau, I. Chygrinau

For citation: Duktava L. G. Representation of female images in modern belarusian prose when illustrating the theme of the Great Patriotic War. *Vestsi Natsyyanal’nai akademii navuk Belarusi. Seryia humanitarnykh navuk = Proceedings of the National Academyof Sciences of Belarus. Humanitarian Series,* 2026, vol. 71, no. 4, pp. 323–331 (in Belarusian). https://doi.org/10.29235/2524-2369-2026-71-4-323-331

© Дуктава Л. Г., 2026

Уводзіны. Ваенная тэматыка адносіцца да ліку магістральных у беларускай літаратуры другой паловы XX – пачатку XXI ст. Тэма батальных падзей 1940-х гг. гучыць шматаспектна, прадстаўлена літаральна ва ўсіх эпічных, лірычных, ліра-эпічных, драматычных жанрах у нацыянальнай літаратуры Беларусі. Да асаблівасцей адлюстравання ваеннай тэмы ў эпічных творах сучасных беларускіх пісьменнікаў, якія асэнсоўваюць падзеі Другой сусветнай вайны на вялікай часавай адлегласці, праз некалькі дзесяцігоддзяў, звяртаюцца даследчыкі М. Курыпка (дысертацыйнае даследаванне “Гераічны і трагічны модусы мастацкасці ў сучасным рамане пра Другую сусветную вайну ў англійскай і беларускай літаратурах (канец XX – пачатак XXI ст.)”) [7], А. Крыклівец (манаграфія “Сучасная беларуская літаратура аб Вялікай Айчыннай вайне: традыцыі, ідэалогія, паэтыка”) [6] і інш. Аднак адным з актуальных і мала распрацаваных з’яўляецца пытанне выяўлення асаблівасцей рэцэпцыі жаночых вобразаў у творах беларускіх празаікаў, якія напісаны ў перыяд новай літаратурнай сітуацыі (пачынаючы з 1986 г.), што абумоўлівае актуальнасць і вызначае мэту дадзенага даследавання. Культурна-гістарычны, параўнальны, апісальны метады аналізу мастацкага тэксту даюць магчымасць вылучыць тэндэнцыі ў паказе жаночых вобразаў у сучасных празаічных творах беларускіх пісьменнікаў розных пакаленняў.

Асноўная частка. Варта адзначыць, што над тэмай адлюстравання падзей Вялікай Айчыннай вайны працуюць прадстаўнікі літаратараў *трох пакаленняў*: удзельнікі ваенных дзеянняў, “дзеці вайны”, а таксама прадстаўнікі нашчадкаў пакалення пераможцаў. Сярод задач даследавання – вылучыць асаблівасці адлюстравання вобраза жанчыны ў творах беларускіх пісьменнікаў – удзельнікаў баявых дзеянняў Вялікай Айчыннай вайны, акцэнтуючы ўвагу на разглядзе вобраза Франі ў аповесці “Пакахай мяне, салдацік” В. Быкава; раскрыць спецыфіку рэцэпцыі жаночых вобразаў у раманах пісьменнікаў пакалення “дзяцей вайны” І. Чыгрынава, У. Гніламедава, прасачыць асаблівасці паказу жанчыны ў вайне ў межах раманнага цыкла І. Чыгрынава; раскрыць традыцыі і наватарства ў адлюстраванні дэндралагічнх вобразаў, якія маюць жаночы пачатак, у эпічных творах пісьменнікаў розных пакаленняў; ахарактарызаваць патэнцыял у рэпрэзентацыі жаночых вобразаў у творчасці пісьменнікаў – прадстаўнікоў нашчадкаў пакалення пераможцаў з улікам новай літаратурнай сітуацыі ў адлюстраванні тэмы Вялікай Айчыннай вайны.

У 1990–2000-я гг. працягваюць свой жыццёвы і творчы шлях пісьменнікі – *удзельнікі ваенных дзеянняў*, чый талент раскрыўся ў савецкі час. Гэта Янка Брыль (1917–2006), Васіль Быкаў (1924–2003), Іван Навуменка (1925–2006), Алесь Адамовіч (1927–1994), Іван Шамякін (1921–2004). У творах савецкага перыяду гэтых аўтараў створаны выдатныя жаночыя вобразы, з дапамогай якіх шматгранна паказаны рысы нацыянальнага характару, лепшыя ўзоры ўвайшлі ў літаратурную скарбніцу айчыннага прыгожага пісьменства. Непакорнасць і моц духу перад ворагам-захопнікам занатаваны ў вобразе Сцепаніды Багацька ў аповесці В. Быкава “Знак бяды” (1982). Жыццястойкасць і ахвярнасць – у вобразе-архетыпе маці, для якой не існуе чужых сыноў, у апавяданні “Маці” (1957) Я. Брыля. У дакументальнай кнізе А. Адамовіча, Я. Брыля, У. Калесніка “Я з вогненнай вёскі…” (1970–1973) жанчыны – жывыя сведкі карніцкіх дзеянняў, тыя, хто захаваў памяць пра пекла па знішчэнні членаў іх сям’і і аднавяскоўцаў. Жаночы пачатак адзначаецца ў шэрагу прыродных вобразаў-сімвалаў ваеннай прозы, падобных па сваёй жыццёвай сімволіцы, – маўклівае супраціўленне, адданасць роднай зямлі і трывушчасць. Гэта вобраз адзінокай сасны ў раманах І. Навуменкі, вобраз самотнай птушкі ў аповесці В. Быкава “Жураўліны крык” (1959).

У 1980–1990-я гг. у беларускай ваеннай прозе з’яўляецца новая плынь пры асэнсаванні падзей 1940-х гг., калі акцэнтуецца ўвага на псіхалогіі “дэфармаванага” вайной пакалення, пра што сведчаць творы і літаратараў гэтага пакалення – “Палон” (1991) М. Аўрамчыка, “Ахвяры” (1988–1989) І. Шамякіна, “Выканаўца” (1994) А. Асіпенкі.

У аповесці В. Быкава “Пакахай мяне, салдацік” адлюстраваны трагічны вобраз беларускі Франі. Дзеянні адбываюцца ў Аўстрыі ў 1945 г. Малады камандзір узвода супрацьтанкавых гармат, лейтэнант Змітрок Барэйка, сустракае на чужыне фактычна напярэдадні доўгачаканай Перамогі сваю зямлячку Франю. Здаецца, нават у час, калі вайна “кацілася пад адхон”, героі знаходзяцца ў атмасферы напружання і трывогі, але іх гутаркі паміж сабой нагадваюць пра звычайнае чалавечае жыццё, дзе ёсць месца каханню, міру, шчасцю, Богу. Выхаваная як ваяўнічая

атэістка, нягледзячы на жахі, з якімі сутыкнулася зашмат у час ваеннага ліхалецця, Франя, пачуўшы арган ды спевы “Аве, Марыя!”, становіцца хрысціянкай, сцвярджае, што Бога не можа не быць. Жанчына на вайне паказана ў аповесці В. Быкава як духоўна трывалая асоба, якую не надламала, “не агрубіла” вайна, яна засталася вернай спрадвечным агульначалавечым каштоўнасцям. Гераіня аповесці адзначае, што галоўнае – гэта чалавечнасць, а не розум, бо разумным можа быць і злачынца. Разам з тым пісьменнік у творы зусім не рамантызуе жаночы лёс у вайне, аўтар акцэнтаваў увагу на “аголенай праўдзе” (Франя загінула), дэтэрмінаванасці трагічнага лёсу дзяўчыны цяжкімі абставінамі ваеннага перыяду, у якіх, здаецца, праходзіць самая лепшая пара чалавека – пара маладосці. Жаночы вобраз у аповесці “Пакахай мяне, салдацік” В. Быкава адлюстраваны ў кантэксце асэнсавання праблемы страчанага пакалення.

У творах пісьменнікаў *пакалення “дзяцей вайны”* Івана Чыгрынава (1934–1996), Уладзміра Гніламедава (1937–2024) прысутнічае трагічнае і гераічнае: трагічнае гучанне народнай бяды падчас ваеннага ліхалецця і гераічны пафас, скіраваны на ўслаўленне подзвігу абаронцаў краіны.

У сярэдзіне 1990-х гг. народны пісьменнік Іван Чыгрынаў працягвае працу над пенталогіяй, якую пачаў у 1970-я гг. Да гэтага часу былі надрукаваны і экранізаваны тры першыя раманы эпічнага цыкла: “Плач перапёлкі” (1972), “Апраўданне крыві” (1977), “Свае і чужыя” (1984). У 1994 г. быў надрукаваны раман “Вяртанне да віны”, у 1996 г. – “Не ўсе мы згінем”. У цэнтры ўвагі эпапеі – народная барацьба, жыццё акупаванай беларускай вёскі падчас ваеннай навалы. Асноўная ўвага літаратуразнаўцаў пры вызначэнні мастацкіх вартасцей раманнага цыкла, герояў твораў сканцэнтравана на вобразах Радзівона Чубара, Дзяніса Зазыбы, але не засталіся па-за ўвагай даследчыкаў літаратуры і жаночыя персанажы ў эпапеі І. Чыгрынава. Т. Грамадчанка адзначае: “Чыгрынаўскіх гераінь цяжка ўявіць са зброяй у руках. Яны думаюць пра тое, чым накарміць дзяцей, трывожацца за лёс мужоў, сыноў, бацькоў” [2, с. 559].

У час, калі ўжо з’явіліся першыя два раманы пенталогіі, пісьменнік у інтэрв’ю ў газеце “Літаратура і мастацтва” выказвае пашану беларускай жанчыне на вайне: “Гэта ж не сакрэт, што яны, можа, зрабілі ў вайне найбольш. Бо неяк умелі і з мужчынамі жыць, неяк умелі і дзяцей нарадзіць, неяк умелі і працаваць, і патомства захаваць, і ваяваць, і хлеб сеяць, і паспагадаць, і раны перавязаць, умелі любіць і ненавідзець. Гэта нейкая ўсёабдымная з’ява – жанчыны ў вайне, асабліва ж вясковыя. Сваіх жонак я найперш пішу са сваёй маці Хадоскі Ігнатаўны” [1, с. 8]. Узгадаем, што ў рамане “Плач перапёлкі” маці пісьменніка выступае прататыпам да персанажа Хадоскі Гаўрыліхі (старшыніхі), паказанай у рамане працавітай і клапатлівай жонкай і маці: «Пакуль верамейкаўцы збіраліся ў гурты ды гаманілі, абмяркоўваючы вясковыя навіны, а больш – тое, што павінны былі сёння рабіць, Гаўрыліха паспела нажаць снапоў на цэлы ўмалот на таку, займаючы паласу як найшырэй. Аксюта Драніцава дарэмна казала – жанчына гэтая ніколі не “ўладала”, хоць была замужам за чалавекам, які доўгі час працаваў старшынёй суседняга з Верамейкамі сельскага Савета, бо ў хаце мела багата малых дзяцей, здаецца, пяцёра ажно, і ёй ці было калі нават адысці ад ночваў» [9, с. 37]. У пенталогіі створана галерэя жаночых вобразаў: Марфа Зазыба, Дуня Пракопкіна, Ганна Карпілава, Палага Хахлова, Вольга Макавец, Анюта Жмэйдава.

З аднаго боку, у раманным цыкле І. Чыгрынава вобраз жанчыны сімвалізуе працяг жыцця. Нават у ваенны час беларуская жанчына нараджае, натхняе, дбае пра сваю сям’ю, тым самым не дазваляе ні сабе, ні іншым блізкім ёй людзям скарыцца перад выклікам часу. Д. Бугаёў адзначае: «Разуменне цяжару жаночай долі, асабліва ў часы ваеннага ліхалецця, ды і агульная стылёвая арыентацыя стрымлівалі пісьменніка ад наўмыснага прыхарошвання вясковых жанчын, вымушалі яго звяртацца да падкрэслена рэалістычных фарбаў. Толькі пра Дуню Пракопкіну гаворыцца, што яе голас “вылятаў з грудзей, як пасярэбраны”. Ёсць таксама свая паэтычнасць, адчувальная больш у падтэксце, чым у прамым стылёвым выяўленні, у паказе радзінаў у Сахвеі Меляшонкавай, на якія, не зважаючы на ўсе нягоды вайны, збіраюцца верамейкаўскія жанчыны. Гэтыя радзіны можна ўспрымаць як сімвал трываласці жыцця, яго ўстойлівасці на разбуральных вятрах часу» [9, с. 14].

З другога боку, у пенталогіі паказана, як спее рашучасць у вермайкаўцаў па супрацьстаянні ворагу, яна датычыцца і жанчын. У рамане “Свае і чужыя” апісана сітуацыя, калі былі забіты нямецкія лётчыкі, якія зрабілі вымушаную пасадку за паўсотню кіламетраў ад лініі фронту.

Па адной версіі, аперацыяй па іх знішчэнні кіравала краснапольская міліцыя і “галоўнай ударнай сілай былі мясцовыя мужыкі, якія аблажылі немцаў з усіх бакоў, маючы на ўзбраенні тапары ды аглоблі” [9, с. 569]. Па другой версіі, знясіленых ворагаў забілі матыгамі сялянскія жанчыны, калі знянацку тыя патрапіліся на іх шляху: “Баранаў цяпер дакладна не ведаў, што здарылася з тымі нямецкімі лётчыкамі пасля, аднак чуў ад кагосьці, што нібыта міліцыянерам не ўдалося давесці іх да Краснаполля. Усе чацвёра палеглі пад ударамі матыг, з якімі накідваліся на іх па дарозе раз’юшаныя вясковыя кабеты… Такая нянавісць ужо была ў людзей да фашыстаў. Вось і сёння гаспадыня гэтай хаты адразу нагадала пра тое, што менавіта вясковыя кабеты, а ні хто іншы, пабілі тады нямецкіх лётчыкаў” [9, с. 569].

Варта адзначыць, што ў першых трох раманах пенталогіі аўтар звяртае ўвагу на тое, што вясковыя жанчыны атаясамліваюцца з маральным стрыжнем народа, які грунтуецца на стойкасці, вернасці роднай зямлі, адданасці сям’і, самаахвярнасці. Гэтыя традыцыі маюць працяг у мастацкім увасабленні жаночых вобразаў, адлюстраваных на старонках раманаў, напісаных у 1990-я гг., – “Вяртанне да віны”, “Не ўсе мы згінем”.

Выпрабаванне на чалавечнасць праз пакуты і жахі праходзіць Ганна, гэты жаночы вобраз адлюстраваны ў рамане “Вяртанне да віны”. На яе вачах была знішчана вёска Бароўка, загінулі родныя. У творы прадстаўлены вобраз не зламанай асобы, а здольнай перажыць сваё гора, працягваць жыць, выхоўваць дзяцей. У творы падкрэсліваецца, што яна не цураецца горкіх успамінаў, а захоўвае памяць, якая для яе не проста памяць пра ўласную старонку біяграфіі, а гэта народная памяць.

І. Чыгрынаў у творы “Вяртанне да віны” закранае пытанне здрадніцтва на вайне. Глыбокім псіхалагізмам прасякнуты вобраз маці паліцая Рэйдзіхі, што з’яўляецца мастацкім увасабленнем мацярынскай трагедыі. Клубок негатыўных пачуццяў суправаджае жанчыну з-за выбару, які зрабіў яе сын Якаў, калі перайшоў на варожы бок. Гэта і пачуццё сораму перад людзьмі за яго ўчынкі, а таксама пачуццё страху і вялікай віны за тое, што не можа сабе адмовіць знайсці і пахаваць цела свайго дзіцяці. Пісьменнік пазбягае адназначнасці ў адлюстраванні жаночых персанажаў, прадстаўленыя ў рамане вобразы паказаны ў віхуры перажыванняў, думак, страхаў, якімі жыве жанчына ў вайне.

У рамане “Не ўсе мы згінем” паказана некалькі пакаленняў вясковых жанчын, яны выступаюць сімвалам стойкасці і рашучасці, што адпавядае аптымістычнай назве твора. Вобраз жонкі Масея Зазыбы з’яўляецца ўвасабленнем такіх якасцей, як прыродная кемлівасць, цярплівасць, мудрасць, самаахвярнасць і чалавечнасць. Нягледзячы на боль, які перажывае Зіна Зазыба, калі сутыкаецца з несправядлівасцю падчас вайны, захоўвае сваю чалавечую годнасць перад тварам ворага, духоўную чысціню.

Вобраз жанчыны ў раманным цыкле І. Чыгрынава – нястомная працаўніца і добрая гаспадыня, верная жонка і клапатлівая маці, а таксама мужная салдатка.

У рамане “Вайна” (2010) У. Гніламедава – пятым творы акталогіі – паказана жыццё жыхароў прыпушчанскага краю ў часы ваеннага ліхалецця. У цэнтры ўвагі – жыццё вясковай сям’і заходнебеларускай вёскі. Шэраг персаніфікаваных раслінных вобразаў твора звязаны з жаночым пачаткам, што ўзбагачае мастацкую тканіну твора, задае пэўную эмацыянальную танальнасць у паказе ваенных падзей. Дэндралагічны код у рамане “Вайна” У. Гніламедава звязаны з вобразамі вішні і сасны. М. Курыпка звяртае ўвагу на сімвалічнае гучанне вобраза сасны ў рамане “Вайна”: “З чалавечай крывёю параўноўвае У. Гніламедаў раны расшчэпленай артылерыяй сасны з праславянскім дрэвам вечнасці, смала якога нібы кроў чалавечая” [7, с. 14]. Адлюстраваная выява, калі быў парушаны ствол сасны, выступае знакам страты мірнага ўсталяванага спакою і парадку. Разам з тым мастацкае ўвасабленне вобраза сасны ў творы У. Гніламедава працягвае традыцыі ў выкарыстанні гэтага вобраза ў ваеннай прозе І. Навуменкі. Надзяленне дрэва “чалавечымі якасцямі” набліжае да прачытання яго кодавага значэння як дрэва-салдата.

Што датычыцца вобраза вішні, адзначым, што ў творах вуснай паэтычнай творчасці ён звязаны з матывам нараджэння, плоднасці. Квітнеючае дрэва сямейства ружовых сімвалізуе дзяўчыну шлюбнага ўзросту.

У сцэне варожага наступлення ў рамане У. Гніламедава “Вайна” вайскоўцы зламалі дрэва, пасля чаго аголенае і скалечанае “цела-ствол” смакоўнай вішні застаецца ляжаць на доле:

«На прыгуменні ў Кужалёў, каля склепа, буйна зарадзіла вішня. Яна пайшла на дэсерт. Ягады яшчэ не даспелі, але кіслінка, мусіць, была дарэчы, таму што вайскоўцы паваліліся на вішаньку ў адначассе і ўсе разам. Дружна, з гоманам, абабралі ніжнія галіны, а вось да верхніх было не дабрацца. А наверсе вішні самыя спелыя. Немцы пераглянуліся паміж сабой, пагергеталі і пачалі з бессаромным нахабствам гнуць дадолу ўсё дрэва. Учапіліся за галіны, за ствол. Дрэва ўпарта не паддавалася.

– Verfluechte! (у перакладзе з нямецкай мовы “праклятае”. – *Л. Д.*) – лаяўся той, што іграў на гармоніку.

Повар прынёс сякеру. Пачалі секчы пад корань. Нарэшце вішню павалілі і, весела зарагатаўшы, абабралі дашчэнту. Ссечанае дрэва ляжала на зямлі голае, згвалтаванае, вываленае ў пяску, зможанае» [3, с. 29]. Зламаная вішня – персаніфікаваны вобраз прыгнечанай дзяўчыны – сімвалізуе маладую і прыгожую Беларусь у трагічны перыяд пачатку Вялікай Айчыннай вайны.

Жанчына ў творы У. Гніламедава паказана як руплівая працаўніца. У творы прысутнічае шэраг сцэн, у якіх адлюстравана калектыўная праца аднавяскоўцаў, падрабязна апавядаецца і пра зладжаны працоўны працэс у вясковым жаночым асяроддзі. Так, у рамане “Вайна” адлюстраваны трагічны момант: калі былі спалены вёскі Ліпна і Лёска Камянецкага павета, прускаўцы прымаюць рашэнне паставіць крыж з ручніком каля царквы як даніну традыцыі аховы падчас вялікай бяды. Да таго ж напярэдадні захопнікі скінулі з прускаўской царквы званы на пераплаўку для патрэб арміі. Згодна з хрысціянскай традыцыяй, і крыж, і ручнік вяскоўцы павінны былі зрабіць у адну ноч: мужчыны – зрабіць крыж, жанчыны – саткаць ручнік. У творы падрабязна распісаны ўвесь працэс працы па вырабу кужальнага палатна, у якім удзельнічаюць жанчыны. У працэсе калектыўнай работы над ручніком, які давялося ствараць за адну ноч, адчуваецца атмасфера адказнасці падчас пачэснай і руплівай працы з ільном: “Церніцу паставілі ў тым жа хляве, дзе ляжаў забыты лён, і хутка прапусцілі праз яе некалькі пакамечаных снапкоў. Адны пры запаленай лампе церлі, другія трапалі, чацвёртыя ладзілі калаўроты і кросны. Асабліва стараліся Света і Ганна Бочка, але праца спорылася і ў іншых. Рабілі як утрапёныя. За кудзелі, запусціўшы пявучыя калаўроты, селі Прося з Гэлькай Відэрка ды яшчэ Шведава Люба. Астатнія, у тым ліку і Фёкла, рабілі аснову і ўток, намотвалі ніткі на цэўкі. Якасць прадзіва прыдзірліва правярала Амелія, якая таксама ўдзельнічала ў агульнай справе – давала парады” [3, с. 437–438]; “Аснову заклалі ручную – як на ручнік. Ткала Фёкла, абазначаная ў гэтай справе. Праз гадзіну-другую атрымалася тонкае кужальнае палатно. Ручнік быў ужо гатовы, заставалася толькі вышыць на канцах арнамент і аздобіць карункамі. Вышывалі Фядора з Хомкавай Волькай, а карункі прынесла жонка Фёдара-японца Паліксена” [3, с. 438].

У раманах У. Гніламедава “Вайна” (2010), “Пасля вайны” (2015) паказаны вобраз славянскай жанчыны, які надзелены такімі рысамі нацыянальнага характару, як гасціннасць, шчырасць, спагада і дабрыня. У рамане “Пасля вайны” Фёкла дзеліцца хлебам, бульбай з жабраком-пагарэльцам, які наведаўся ў вёску: «“На падаянне жыву. Хто што дасць. Можа, хоць варыўца сырога? Можа, картоплі ёсць? У прысаку спяку… Здаецца, каб пад’есці хлеба даволі, дык і бяды б не было. Есці надта хочацца”. Фёкла прынесла з дзясятак бульбін і лусту хлеба з рэшткамі запечаных кляновых лісцяў. Не дай, дык тады самой соромна хлеб той есці. Але які там хлеб? Хлеб яна пякла дамешчваючы грэцкую муку, а часцей – драную бульбу, дадавала льняны або канапляны жмых» [4, с. 9]. Сутнасць гасціннасці заключаецца ў прадстаўленні чужынцу ўвагі і абароны. Разам з хлебам звязана ўяўленне пра долю чалавека. Хлеб выступае ўвасабленнем добрага лёсу чалавека. Сімвалічнае пажаданне лепшай долі ў творы паказана ў сцэне, калі Фёкла не толькі частуе, але і дае жабраку з сабой гасцінец: “Прасівец, атрымаўшы лусту хлеба, печанага з бульбай, перакінуў цераз плячо свае хатулі, яшчэ раз падзякаваў і патэпаў сваёй дарогай. Фёкла доўга пазірала яму ўслед, пра нешта думала” [4, с. 10].

У характары славян – павага да госця, адна з праяў якой выражаецца ў жаданні падзяліцца лепшым пачастункам. У рамане “Вайна” такой гасціннай гаспадыняй паказана ўдава Аграфена, што жыве на хутары, які наведалі партызаны: “Сапраўды, Аграфена была такая, што не магла не адгукнуцца на людскую бяду і не падтрымаць тых, хто ступіў на сцяжыну змагання са злом, якое прыйшло аднекуль на яе зямлю. Яна моўчкі абварыла бульбы, падагрэла боршч, разлажыла

ў міскі салёныя гуркі і капусту, паклала на стол некалькі пузакаватых цыбулін. Знайшла нават пляшку самагонкі. Гасцінная была кабета, бо ў дадатак да ўсяго пачала яшчэ з яечнай мукі пячы аладкі" [3, с. 171]. Але цёплая сустрэча скончылася трагічна, бо партызаны на хутары папалі ў акружэнне, трапіўшы ў "пастку" часцей вермахта. Здаецца, што ў момант, калі Аграфена адчувае, што фактычна нічым не можа дапамагчы і абараніць ад бяды завітаўшых у яе хату людзей, ёй застаецца толькі маліцца перад абразом Багародзіцы-заступніцы. І яна "упала ў покуце перад абразом на калені і пачала гучна маліцца, а потым не вытрымала і роспачна залямантавала" [3, с. 173]. Сапраўды, любая вайна – гэта ў першую чаргу супрацьстаянне ідэй, духоўнай моцы. І нават калі ў чалавека няма ў руках зброі, яго духоўная еднасць з абаронцамі на нябачным сілавым полі ўзнімае на барацьбу, дае магчымасць не страчваць надзеі і, канешне, набліжаць момант Перамогі.

Тэма Вялікай Айчыннай вайны набывае новае гучанне ў творчасці пісьменнікаў, якія нарадзіліся пасля Перамогі 1945 г., – *прадстаўнікоў нашчадкаў пакалення пераможцаў*, – Міхася Пазнякова (нар. 1951), Зінаіды Дудзюк (нар. 1950) і інш.

Гуманістычны падмурак мае вобраз Марфы ў апавяданні "Дабрыня" (2015) М. Пазнякова. Нягледзячы на вялікі матчын боль, яна гатовая сагрэць і падтрымаць кожнага. Нагадаем пра традыцыі беларускай літаратуры па стварэнні велічнага і праніклівага вобраза беларускай жанчыны-сялянкі, у якой баліць сэрца не толькі за сваіх дзяцей, але і за чужых. Вобраз-архетып маці прысутнічае ў творах трох пакаленняў літаратараў беларускай ваеннай прозы розных перыядаў развіцця беларускай літаратуры. Гэта апавяданне "Маці" (1957) Я. Брыля, раман "Вайна" (2010) У. Гніламедава, апавяданне "Дабрыня"(2015) М. Пазнякова.

У апавяданні "Дабрыня" М. Пазнякова прысутнічае матыў мацярынскай самаахвярнасці. Падобны жаночы вобраз адлюстраваны ў пранікнёным апавяданні "Маці" Я. Брыля, у якім гераіня твора ў адным з эпізодаў, нягледзячы на смяротную пагрозу, вырашае дапамагчы беглым з лагера і пачаставаць прасіўцаў, але сама пападае ў пастку за тое, што пашкадавала чужых сыноў, як магла б дбаць пра сваіх. Але ў апавяданні "Дабрыня" М. Пазнякова гэты вобраз жанчыны набывае асаблівы накал, бо паказана маці, якая, нягледзячы на страту закатаванага захопнікамі сына, здольная шкадаваць варожага салдата. Марфа шэпча ўслед разгубленаму і заплаканаму немцу, які пакідае вёску, не праклёны, а пажаданне вярнуцца як мага хутчэй да сваіх родных: "Хай дачакаюцца дзеткі бацьку. Хай дабярэцца да сям'і салдат" [8, с. 15]. Разуменне чалавечага болю сведчыць пра духоўную веліч і мужнасць, якія адлюстраваны ў гэтым жаночым вобразе. Сэрца маці мацнейшае за варожую ўзброеную сілу і яе салдат.

Традыцыі дакументальна-мемуарнай прозы пры адлюстраванні вобраза жанчыны падчас вайны працягвае З. Дудзюк, гэта шматгалоссе ўспамінаў прадстаўлена ў выданні "Выжыць на дарозе смерці".

Асаблівае месца ў творах сучасных празаікаў на тэму Вялікай Айчыннай вайны надаецца асэнсаванню жаночага подзвігу. Назіраецца эвалюцыя вобраза жанчыны, для якой характэрна ваяўнічасць, рашучасць падчас супраціўлення ворагу. Калі для твораў савецкага часу характэрны стрыманы паказ, то паступова мастакі слова звяртаюцца да пранікнёнага псіхалагізму ў адлюстраванні жанчыны на фронце, у тыле, у акупацыі. Яны не проста выконвалі ваенную працу (санітаркі, сувязісткі, разведчыцы, падпольшчыцы, партызанкі), але і станавіліся ўвасабленнем мужнасці, стойкасці і міласэрнасці ў самых нечалавечых умовах.

Тэма Вялікай Айчыннай вайны прысутнічае ў творах сучасных беларускіх празаікаў на маральна-этычную тэматыку, у якіх разам з адлюстраваннем рэалій сучаснага жыцця беларускага грамадства закранаюцца хвалюючыя пытанні здрадніцтва на вайне ("Па веры вашай" У. Гаўрыловіча), забойства або пакарання ("Свая філасофія вайны" У. Мароз), віны і прабачэння за карніцкія дзеянні ("Дараванне" А. Брава).

Пасля вайны наступае мірнае жыццё і паўстае новае пытанне – пытанне прабачэння. Прайшло некалькі дзесяцігоддзяў пасля Перамогі, нарадзіліся ўнукі і праўнукі тых, чыё жыццё было апалена вайной, з'явіўся новы дзяржаўны лад на абсягах былой савецкай краіны, сталі адкрытымі межы паміж дзяржавамі, якія раней прадстаўлялі сабой розныя – сацыялістычны і капіталістычны – блокі. Свет скіраваўся да пашырэння і развіцця сувязей паміж рэгіёнамі, краінамі, людзьмі,

але ў гісторыі кожнай беларускай сям'і жыве памяць пра трагедыю пякельных саракавых гадоў як асабістую бяду, крыўду і непрабачэнне за людскія страты. Цяжка папрасіць прабачэння за карніцкія дзеянні, але і дараваць таксама цяжка.

Тэму віны і прабачэння закранае А. Брава (нар. 1966) у аповесці "Дараванне" (2011). Дзеянні ў творы адбываюцца ў канцы XX стагоддзя падчас адкрыцця "жалезнай заслоны" паміж былымі савецкімі рэспублікамі і замежжам. Адна з прыкметных сацыяльных з'яў таго часу – сітуацыя, калі дзяўчаты і жанчыны былой краіны саветаў сталі выходзіць замуж за замежнікаў, іх лёс надалей складаўся за мяжой. Галоўная гераіня твора Ларыса Вашкевіч-Краўз узяла шлюб з немцам Ральфам, пераехала ў Германію. Яны жывуць у доме разам з хворым свёкрам Гансам, ветэранам вайны, які пакутуе на хваробу Альцгеймера і паступова страчвае сувязь з рэальнасцю. Беларускай эмігрантцы выезд за мяжу матываваны жаданнем палепшыць матэрыяльнае становішча. Але мары пра замежную казку і бесклапотнае жыццё разбіваюцца ўшчэнт, калі ў Германіі яна сутыкаецца з тым, што вымушана працаваць даглядчыцай старога хворага чалавека. Спачуванне, цярплівасць, пакора – якасці, якімі валодае галоўная гераіня, не губляе іх, здаецца, ні пры якіх абтавінах. Але своасаблівым іспытам на чалавечнасць з'яўляецца сітуацыя, якая звязана з ваеннай тэмай у аповесці.

"Рэха вайны" ў творы адчувальнае, асабліва гэта паказана ў сцэне, калі Ларыса даведалася пра тое, што былы салдат Ганс у гады вайны быў на яе малой радзіме: "А калі ён, каверкаючы, вымавіў назву з дзяцінства знаёмага ёй горада, яна не магла больш падманваць сябе: менавіта так усё і было – невыпадкова ён тады распытваў яе, і пра аэрадром дакладна ведаў… Унутры яе нібыта штосьці абарвалася… Некалькі начэй пасля гэтага яна ляжала без сну, і патрабавальнае гуканне старога, гучнае, як баявая труба, выдатна чутнае нават на другім паверсе, гуканне, якое раздавалася звычайна каля чатырох, апярэджваючы ўсе ранішнія гукі вёскі, заспявала яе з мокрым ад слёз тварам" [5, с. 31–32]. Аўтар паказвае цяжкі ўнутраны крызіс. З аднаго боку, Ларыса адчувае боль і нянавісць, а трэба знайсці сілы, каб іх пераступіць. З другога боку, далёка ад малой радзімы яна не згубіла еднасці з роднай зямлёй, бо ніякае матэрыяльнае дабро не можа знішчыць з памяці Ларысы крэўную сувязь.

Ларыса паўстала перад выбарам: прабачыць або не дараваць? Зразумела, што яна не можа дараваць чалавеку, які на яе малой радзіме калісьці ўдзельнічаў у карніцкіх аперацыях. Пякельныя ўспаміны пра трагічную гісторыю роднай вёскі, пра лёс аднавяскоўцаў і сям'і ў часы ваеннага ліхалецця не даюць спакою і быццам правакуюць на помсту. Яна адчувае, што не хоча дапамагаць хвораму свёкру Гансу Краўзу, былому нямецкаму салдату, лёс якога быў звязаны з трагічнымі часамі ў яе родных мясцінах. Аднак і не дапамагчы хвораму чалавеку, які знаходзіцца ў такім цяжкім стане, гучыць як прысуд. Прабачыць або не дараваць? Пісьменніца вымушае чытача падумаць над гэтым пытаннем, хоць і не дае на яго прамога адказу.

Атмасфера напружанасці і драматызму ў творы мяняецца, калі нечакана Ларыса трапіла на дзённікавыя запісы Ганса. Пачаўшы чытаць яго ўспаміны, змешчаныя ў сшытку, які быў выпадкова знойдзены, Ларыса даведалася пра каханне Ганса і дзяўчыны Зосі падчас вайны, пра яго шчырае жаданне ўратаваць яе ад бяды і трагедыю, якую ён перажыў, убачыўшы яе забітай. Да канца жыцця Ганс шукае адказы на складаныя пытанні сэнсу гвалтоўнага нападу на землі савецкай краіны: «У лесе мне паказалі сляды партызанскага лагера: папялішчы, крэпасці з бярвення. Раніцай бачыў у вёсцы павешанага партызана. На грудзях у яго дошчачка з надпісам: "Я забіваў нямецкіх салдат". Навошта мы прыйшлі на гэтую зямлю? Каб забіваць і быць забітымі?» [5, с. 69].

Кульмінацыйны момант аповесці – момант даравання. Знаходзячыся ў іншай краіне, Ларыса, па ўспамінах Ганса, зноў перажывае мінулую трагедыю сваёй сям'і, спаленай вёскі. Суперажыванне быццам яднае, робіць роднаснымі душы Ларысы і былога нямецкага салдата Ганса, які спрабаваў адвесці бяду ад тых, хто быў блізкім яе сэрцу.

Высновы. Такім чынам, у эпічных творах беларускіх празаікаў мяжы XX–XXI стст. адчуваецца захаванне традыцыі асэнсавання вайны, а таксама адлюстравання жаночых вобразаў – клапатлівай маці, для якой не існуе "чужых сыноў", вернай жонкі, нястомнай працаўніцы, салдатцы.

Новая хваля ў паказе вайны і вобраза жанчыны датычыцца таго, што празаікі трох пакаленняў літаратараў ад звароту да гераічнага пафасу скіраваліся да выкрыцця псіхалагічных перапетый пры адлюстраванні трагедыі “маленькага чалавека”, паказе жанчыны на вайне. Звяртаючыся да вобраза Франі ў аповесці “Пакахай мяне, салдацік”, В. Быкаў узнімае пытанне, як вайна крадзе ў дзяўчат маладосць і будучыню, у фокусе аўтарскай увагі знаходзіцца тэма страчанага пакалення. Разам з тым у творы падкрэсліваецца, што вайна “не агрубіла” людзей, маладая жанчына паказана як высока духоўная асоба.

У раманных цыклах пісьменнікаў пакалення “дзяцей вайны” І. Чыгрынава, У. Гніламедава выразна акрэслена тэма жанчыны-маці і вясковай працаўніцы. У пенталогіі І. Чыгрынава жаночыя вобразы Марфы Зазыба, Ганны Карпілавай, Зіны Зазыба вылучаюцца неверагоднай стойкасцю, унутранай высакароднасцю. Для жанчын у раманным цыкле характэрна стрыманасць на словы, жыццёвая мудрасць, што дазваляе ім захаваць чалавечнасць нават на папялішчы. Праз асобы сваіх гераінь (напрыклад, Фёкла, Аграфена) у раманах “Вайна”, “Пасля вайны” пісьменнік У. Гніламедаў паказвае ўменне знаходзіць сілы перажыць любыя трагедыі, міласэрнасць, маральную чысціню, гатоўнасць да самаахвярнасці. Абодва пісьменнікі, засноўваючыся на асабістых дзіцячых успамінах пра вайну, паказваюць сваіх гераінь са спачуваннем, падкрэсліваюць іх пакутніцкі лёс. Па сутнасці, на іх плечы кладзецца адказнасць за захаванне роду і маральных каштоўнасцей.

У рамане “Вайна” У. Гніламедава дэндралагічныя вобразы маюць жаночы пачатак, іх выкарыстанне ў прозе на тэму Вялікай Айчыннай вайны – працяг традыцыі, закладзенай у літаратуры савецкага часу, скіраваны на падкрэсленне трагічнага стану, у якім аказалася жанчына на вайне, як і ў цэлым краіна.

У творчасці празаікаў, якія з’яўляюцца прадстаўнікамі нашчадкаў пакалення пераможцаў, адзначаецца новая хваля ў асэнсаванні гістарычнага канфлікту, рэпрэзентацыі жаночых вобразаў. Вайна часта разглядаецца не толькі як мінулая падзея, а праз прызму памяці, якая баліць, гэта па сутнасці траўма, якая ўплывае на нацыянальную свядомасць і сучаснасць. У творах сучасных празаікаў пры асэнсаванні падзей Вялікай Айчыннай вайны жаночыя вобразы падаюцца ў звязцы з адлюстраваннем тэмы міласэрнасці (выратаванні жыцця іншых людзей) і захаваннем духоўнасці ў любых умовах.

У цэлым, у беларускай прозе вобраз жанчыны паказаны ў кантэксце адлюстравання спалучэння трагізму вайны і пошуку асабістага шчасця. Гэтая тэма развіваецца ў рэчышчы дакументалістыкі і псіхалагічнай рэфлексіі. Мастацкая думка сучасных празаікаў Беларусі надзвычай чуйная да памяці пра трагічныя старонкі ваенных часоў сярэдзіны мінулага стагоддзя і яе шматгалосных адбіткаў у сучасным жыцці. Вобраз жанчыны ў беларускай ваеннай прозе падчас новай літаратурнай сітуацыі – шматаблічны, шматсімвалічны, адлюстраваны ў кантэксце адвечнага, маштабнага і шматаспектнага пошуку трывалых асноў духоўнасці.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Гіль, М. Раман – гэта народ: [інтэрв’ю з лаўрэатам прэміі БССР Іванам Чыгрынавым] / М. Гіль // Літаратура і мастацтва. – 1979. – 29 чэрв. (№ 26). – С. 7–9.

2. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: у 4 т. / НАН Беларусі, Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Ін-т літ. імя Я. Купалы; навук. рэд.: У. В. Гніламедаў, С. С. Лаўшук. – Мн.: Бел. навука, 2002. – Т. 4, кн. 1: 1966–1985. – 928 с.

3. Гніламедаў, У. Вайна: раман / У. Гніламедаў. – Мн.: Бел. навука, 2014. – 626 с.

4. Гніламедаў, У. Пасля вайны: раман / У. Гніламедаў. – Мн.: Бел. навука, 2021. – 522 с.

5. Дараванне: аповесці / А. Ждан, А. Брава, А. Федарэнка [і інш.]. – Мн.: Аверсэв, 2023. – 317 с.

6. Крикливец, Е. В. Современная белорусская литература о Великой Отечественной войне: традиции, идеология, поэтика / Е. В. Крикливец. – Витебск: ВГУ, 2025. – 132 с.

7. Курыпка, М. Гераічны і трагічны модусы мастацкасці ў сучасным рамане пра Другую сусветную вайну ў англійскай і беларускай літаратурах (кан. XX – пач. XXI ст.): аўтарэф. дыс. … канд. філал. навук: 10.01.03; 10.01.01 / Курыпка Мікалай Алегавіч; Бел. дзярж. ун-т. – Мн., 2022. – 24 с.

8. Пазнякоў, М. П. Хлеб для партызанаў: апавяданні, эсэ, аповесць / М. П. Пазнякоў. – Мн.: Чатыры чвэрці, 2015. – 93 с.

9. Чыгрынаў, І. Выбраныя творы / І. Чыгрынаў. – Мн.: Харвест, 2008. – 992 с.

References

1. Gil' M. Roman is a people. *Litaratura i mastatsva* [Literature and Art], 1979, June 29, pp. 7–9 (in Belarusian).

2. *History of Belarusian literature of the 20th century. Vol. 4, book 1: 1966–1985.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2002. 928 p. (in Belarusian).

3. Gnilamedau U. *The war.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2014. 626 p. (in Belarusian).

4. Gnilamedau U. *After the war.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2021. 522 p. (in Belarusian).

5. Zhdan A., Brava A., Fedarenka A., Badak A., Benzyaruk A. *Forgiveness. Stories.* Minsk, Aversev Publ., 2023. 317 p. (in Belarusian).

6. Kriklivets E. V. *Contemporary Belarusian literature about the Great Patriotic War: traditions, ideology, poetics.* Vitebsk, Vitebsk State University, 2025. 132 p. (in Russian).

7. Kurypka M. *Heroic and tragic modes of artistry in the modern novel about World War II in English and Belarusian literature (late 20th – early 21st centuries).* Abstract of Ph. D. diss. Minsk, 2022. 24 p. (in Belarusian).

8. Paznyakou M. P. *Bread for the Partisans.* Minsk, Chatyry chvertsi Publ., 2015. 95 p. (in Belarusian).

9. Chygrynau I. *Selected works.* Minsk, Kharvest Publ., 2008. 992 p. (in Belarusian).

Информация об авторе

Дуктова Любовь Георгиевна – кандидат филологических наук, доцент. Белорусский государственный университет (пр-т Независимости, 4, 220030, Минск, Республика Беларусь). E-mail: duktova.liubou7@gmail.com

Informatiom about the author

Liubou G. Duktava – Ph. D. (Philol.), Associate Professor. Belarusian State University (4 Nezavisimosti Ave., Minsk 220030, Belarus). E-mail: duktova.liubou7@gmail.com

ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)

ПРАВА

LAW

УДК 34.09
https://doi.org/10.29235/2524-2369-2026-71-4-332-342

Поступила в редакцию 17.04.2026
Received 17.04.2026

А. В. Денисевич[1], А. С. Валевко[2]

[1]Белорусский государственный университет, Минск, Беларусь
[2]Полоцкий государственный университет им. Евфросинии Полоцкой, Новополоцк, Беларусь

ТЕОРЕТИКО-ПРИКЛАДНЫЕ ПРОБЛЕМЫ ПОСТРОЕНИЯ ОБЩЕЙ СИСТЕМЫ ДЕЛИКТОЛОГИИ (ПЕНОЛОГИИ)

Аннотация. Статья посвящена концептуальным и прикладным проблемам формирования общей деликтологии как интегративной межотраслевой науки, предметом которой выступают все виды правонарушений – преступления, административные деликты, гражданско-правовые нарушения и дисциплинарные проступки – в их взаимосвязи, взаимообусловленности и системном единстве. Обосновывается актуальность создания единой теоретической платформы, позволяющей преодолеть сложившиеся междисциплинарные и отраслевые барьеры, которые традиционно препятствуют целостному осмыслению феномена противоправного поведения. Систематизируются основные факторы, тормозящие построение общей деликтологии: разнородность правовой природы деликтов, вытекающая из различий в целях, принципах и методах отраслевого регулирования; отсутствие унифицированного понятийного аппарата, что затрудняет научную интеграцию и компаративные исследования; недостаточная разработанность общетеоретических оснований деликтологии в отечественной юриспруденции, а также фрагментарность эмпирических исследований, учитывающих взаимопереходы различных видов правонарушений, и др. Проведен сравнительный анализ административной деликтологии и криминологии, в рамках которого выявляются критерии разграничения и точки соприкосновения указанных направлений, а также рассматривается проблема соизмерения степени общественной опасности различных видов деликтов. Анализируются теория полиморфизма правонарушений, предлагающая многомерные классификации деликтов, а также концепции типизации и индивидуализации процессов деликтизации, включая криминализацию, декриминализацию, пенализацию и депенализацию. Отдельное внимание уделяется методологическим аспектам измерения степени общественной опасности деяний, вопросам дифференциации вида и размера наказания (взыскания), а также проблемам определения и количественной оценки наказуемости как ключевого элемента эффективности правового реагирования.

Ключевые слова: деликтология, пенология, полиморфизм, деликтизация, пенализация, типизация, индивидуализация, стигматизация, деликтологические факторы

Для цитирования: Денисевич, А. В. Теоретико-прикладные проблемы построения общей системы деликтологии (пенологии) / А. В. Денисевич, А. С. Валевко // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. – 2026. – Т. 71, № 4. – С. 332–342. https://doi.org/10.29235/2524-2369-2026-71-4-332-342

Aleksandr V. Dzenisevich[1], Alexandra S. Valevko[2]

[1]Belarusian State University, Minsk, Belarus
[2]Euphrosyne Polotskaya State University of Polotsk, Novopolotsk, Belarus

THEORETICAL AND APPLIED PROBLEMS OF BUILDING A GENERAL SYSTEM OF DELICTOLOGY (PENOLOGY)

Abstract. The article is devoted to the conceptual and applied problems of the formation of general delictology as an integrative interdisciplinary science, the subject of which is all types of offenses – crimes, administrative torts, civil law violations, and disciplinary offenses – in their interrelation, interdependence, and systemic unity. The relevance of creating a unified theoretical platform is substantiated, which allows overcoming the established interdisciplinary and sectoral barriers that traditionally hinder a holistic understanding of the phenomenon of illegal behavior. The paper systematizes the main factors that hinder the development of general delictology: the heterogeneity of the legal nature of torts, which stems from the differences in the goals, principles, and methods of sectoral regulation; the lack of a unified conceptual framework, which

© Денисевич А. В., Валевко А. С., 2026

makes scientific integration and comparative research difficult; and the insufficient development of the general theoretical foundations of delictology in jurisprudence, as well as the fragmentary nature of empirical studies that take into account the intersections of various types of offenses, etc. A special place in the article is occupied by a comparative analysis of administrative delictology and criminology, which identifies the criteria for distinguishing and points of contact between these areas, as well as examines the problem of measuring the degree of public danger of various types of torts. The article analyzes the theory of polymorphism of offenses, which offers multidimensional classifications of torts, and the concepts of typification and individualization of the processes of tort, including criminalization, decriminalization, penalization and depenalization. Special attention is paid to the methodological aspects of measuring the degree of public danger of acts, the issues of differentiating the type and amount of punishment (penalty), and the problems of defining and quantifying punishability as a key element of the effectiveness of legal response.

Keywords: delictology, penology, polymorphism, delictization, penalization, typification, individualization, stigmatization, delictological factors

For citation: Dzenisevich A. V., Valevko A. S. Theoretical and applied problems of building a general system of delictology (penology). *Vestsi Natsyyanal'nai akademii navuk Belarusi. Seryia humanitarnykh navuk = Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus. Humanitarian Series,* 2026, vol. 71, no. 4, pp. 332–342 (in Russian). https://doi.org/10.29235/2524-2369-2026-71-4-332-342

Введение. Деликтология (от лат. *delictum* – правонарушение) – междисциплинарная наука, изучающая все виды противоправных деяний, её предмет охватывает генезис, детерминацию, структуру, динамику, профилактику и правовое регулирование деликтности (пенология – частная теория деликтологии) [1]. Наметившаяся тенденция, обусловливающая дальнейшее формирование данной науки, – гибридное развитие института деликтизации – приводит к выработке новых составов деликтов [2] с учетом общественных потребностей и государственных интересов. Одновременно происходит процесс упорядочения системы деликтов с целью усиления гарантий защиты прав и интересов участников правоотношений (в том числе компенсационного характера), связанных с тем или иным видом нарушений. В этой связи в последние десятилетия в юридической науке всё активнее обсуждается идея построения общей системы деликтологии – единой теоретической конструкции, которая могла бы интегрировать знания о всех типах правонарушений, выявить их общие черты и предложить универсальные методы исследования и противодействия. Однако создание такой системы сталкивается с серьёзными терминологическими, методологическими и правовыми препятствиями.

Основная часть. Деликтология представляет систему знаний о деликтности, факторах, детерминирующих ее развитие; о генезисе деформации личности и механизме нарушения норм права; о взаимосвязи между отдельными видами деликтов; о средствах и способах противодействия отдельным видам деликтов и деликтности в целом; о критериях оценки состояния деликтности и эффективности мер воздействия на нее [3].

